Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 60 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародзіі — 20 к. мясцовых — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шпаргалі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шпаргалі наперад тэксту 1 р. — к. За радок шпаргалі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьдвоеныя на 50 проц. дарожэй. Зьмена тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА у канторы газэты, на ўсіх аддаленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пош.-тэл. аддзелах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

10 год выд... ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА № 263 (2752) Аўторак, 19-га лістапада 1929 г.

154 кр. "Савецкая Беларусь" Одесса, Пастера 13, государ-ственн. публичн. библиотека. отдел. сьвод. отдѣл. экз. адзін экз.

ПЛЕНУМ ЦК УсеКП(б).

(ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ)

МОСКВА. 17 лістапада адбыўся пленум Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б). Пленум разглядзеў наступныя пытаньні:

1. Дырэктывы аб кантрольных лічбах народнае гаспадаркі на 1929-30 г.;
2. Вынікі і далейшыя задачы савецкага будаўніцтва;
3. Даклад ЦК КП(б)У аб рабоце вёскі;
4. Аб саюзным Наркамземе;
5. Аб выкананьні пастаноў лічнага пленуму ЦК па падрыхтоўцы тэхнічных кадраў.

Акрамя гэтага, пленум разглядзеў пытаньне аб групе правых ухілістаў (група т. Бухарына).

Выходзячы з рашэньня пленуму ВККІ і бяручы пад увагу, што лідэры правых ухілістаў (т. т. Бухарын, Рыкаў, Томскі) не адмовіліся ад сваіх памылак,—пленум пастанавіў вывесьці т. Бухарына, які зьяўляецца ідэалёгам правага ўхілу, са складу палітбюро ЦК УсеКП(б). Астатнім-жа таварышам зрабіў папярэджаньне ў тым, што ў выпадку найменшай спробы з іх боку працягваць барацьбу супроць лініі і рашэньняў ЦК УсеКП(б)—партыя неадкладна прыйме супроць іх арганізацыйныя захады.

Члены ЦК—т. т. Котаў, Міхайлаў, Угланаў і Кулікаў заявілі пленуму аб сваім разрыве з правымі ўхілістамі.

Пленум намеціў скліканьне чарговага партыйнага зьезду на май 1930 году.

Пленум пастанавіў увесьці т. ГАМАРНІКА ў склад аргбюро ЦК УсеКП(б) і т. ШВЭРНІКА—кандыдатам аргбюро ЦК УсеКП(б).

Вынікі і пэрспэктывы.

Пленум ЦК УсеКП(б), які скончыў працу, падкрэсьліў шэраг буйных палітычных вынікаў мінулага гаспадарчага году і намеціў шырокія пэрспэктывы новай паласы сацыялістычнага будаўніцтва, у якую ўваходзіць партыя. Пленум адобрыў кантрольныя лічбы на бягучы год. Самае галоўнае ў гэтых кантрольных лічбах—включэнне ў буйным тэмпе развіцьця сацыялістычнай гаспадаркі, на якое адыходзячым ад памяці пятгодзьдзя, але і значна перавышаючым кітайскі лёзунг—дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны—ажыцьцяўляецца намі на практыцы, і да гэтага надыходзячага гаспадарчага году ставіны мець прыблізна падвойны абазьмеры даваеннай прадукцыі ў гарадах і саўгасах.

У кантрольных лічбах асабліва яскрава падкрэсьлена кіруючая роля буйной прамысловасьці. На ўсіх галінах яе галінах (электрабудаўніцтва, чорная і каляровая металюргія, машынабудаўніцтва і г. д.) кантрольныя лічбы значна выходзяць за рамкі пяцігодкі. Адзіным выключэньнем зьяўляецца хімічная прамысловасьць, у якой мы крыху адстаем ад заданьня пяцігадовага пляну.

Калі прыходзіцца гаварыць аб вялізарным значэньні гэтай галіны прамысловасьці асабліва ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Партыя павінна аддаць вялізарную ўвагу пытаньням развіцьця хімічнай прамысловасьці і дамагчыся ў кароткі тэрмін рашучага пералому гэтым важнейшым вучастку будаўніцтва сацыялізму.

Калі вялікія посьпехі, якіх дасягнула краіна ў справе развіцьця сацыялістычнай прамысловасьці, тлумачацца перадусім за ўсё магутным уздымам актыўнасьці рабочых мас, якая знайшла асабліва яскравае выяўленьне ў разгорнутым сацыялістычн. спаборніцтве, то гэта ўзрастаючая актыўнасьць, пашыраючае згуртаваньне рабочае клясы вакол партыі, зьяўляецца цьвёрдай апорай для рэкордных тэмпаў развіцьця, якія намячаюцца кантрольнымі лічбамі.

Галоўнейшай умовай выкананьня такіх тэмпаў у бягучым годзе зьяўляецца зьніжэньне сабекошту прамысловай прадукцыі на 11 проц. Яна і дае магчымасьць партыі ня толькі ў сапраўднасьці намечаны плян капітальнага будаўніцтва, рэканструкцыі ў прамысловасьці і росту яе прадукцыі, але і значна павялічыць рэальны заробак рабочых (у сярэднім на 12 проц.). Ня трацячы ні адной хвіліны, і партыйныя арганізацыі павінны кінуць самую энэргічную працу па зьніжэньні сабекошту. Меншавітоўскія вынікі, дасягнутыя партыяй у справе развіцьця цяжкай індустрыі (рэканструкцыя машынабудаўніцтва), ўзмоцнілі кіруючую ролю прамысловасьці ў справе ўздыму і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, пры правільнай агульнай палітыцы партыі ў вёсцы, стварылі спрыяючыя ўмовы для вырашэньня галоўнай праблемы, якая рабіла нашу краіну цяжкасьці ў працягу двух гадоў.

Канцэнтраванае выкананьне хлебазагатовак пляну ў шэрагу буйнейшых раёнаў, стварэньне значных хлебных рэзэрваў на базе шырокага працэсу, уздыму і сацыялістычнага ператварэньня сельскай гаспадаркі, непераканальнему карканьню правых ухілістаў, няўхільна сьведчаць аб тым, што выходзім з цяжкасьцяў на хлебным фронце.

Перад партыяй на ўсёй шырыні пастае зараз праблема жывёлагадоўлі. Яе пасьпяховым вырашэньнем звязана ня толькі радыкальнае вырашэньне пытаньняў забясьпечэньня харчамі працоўных мас, але і стварэньне цвёрдай базы сыравіны для цэлага шэрагу галін прамысловасьці.

Пленум асабліва ўважліва і дакладна абгаварыў пытаньні калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Фактычныя вялічэзныя вынікі, дасягнутыя партыяй у гэтай галіне і перавысіўшыя ўсе самыя аптымістычныя разьлікі і наметкі, дазваляюць са ўсёй рэальнасьцю ставіць пытаньне аб сплошнай калектывізацыі вялічэзных райёнаў СССР з дзесяткамі міліёнаў насельніцтва (Паўн. Каўказ, стэпная Украіна, Ніжн. Паволжа і г. д.) у працягу якіх-небудзь 2 гадоў. Панікёрству і хвасьцізму правых ухілістаў, да самага апошняга часу сьцьвярджаўшых, што сяляне ня пойдуць у калгасы, зроблены сапраўдны зьніштажаючы ўдар. Але вялічэзны тэмп калектывізацыі сялянскіх гаспадарак робіць для партыі асабліва складанымі і цяжкімі задачы кіраўніцтва калгасным рухам. Іменна зараз са ўсёй вострасьцю ставіцца пытаньне аб сацыялістычнай перабудове міліёнаў аб'яднаных у калгасы сялянскіх гаспадарак, з чым непарыўна зьвязана самая грунтоўная перамога над дробна-уласьніцкай псыхалёгіяй, якую селянін прыносіць з сабой у калгасы. Пытаньні забясьпечаньня машынамі (асабліва забясьпечаньня трактарамі) і арганізацыі працы робяцца рашаючымі пытаньнямі калгаснага будаўніцтва. Партыя павінна таксама ўявіць сабе зусім ясна тое, што пацярпеўшы няўдачу ў спробах устрымаць беднату і серадняка ад масавага ўваходу ў калгасы кулак будзе спрабаваць далей перанесьці сваю разлагаючую антысавецкую работу ў сярэдзіну калгасаў, утварыўшы сабе там апорныя пункты ў барацьбе супроць палітыкі партыі. Няма чаго і гаварыць аб прыёме кулака ў калгас. Больш таго, мясцовыя партыйныя арганізацыі павінны паставіць сваёй ударнай задачай ачышчэньне калгасаў ад кулацкіх элемэнтаў. Масавы працэс калектывізацыі, ахапіўшы вёску, партыя павінна выкарыстаць для канчатковай і поўнай палітычнай ізаляцыі кулака.

У разрэзе агульных задач сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі пленум у якасьці асобнага пункту парадку дню разгледзеў пытаньне аб рабоце ў гэтае галіне Украінскай партыйнай арганізацыі. Ня прыходзіцца падрабязна спыняцца на тых мерапрыемствах, якія праводзіць партыя на фронце сельскае гаспадаркі. Украінская стэп зьяўляецца магутнай базай для развіцьця сельска-гаспадарчага экспарту, здольнай ужо ў бліжэйшыя гады выкінуць на сусветны рынак сотні мільёнаў пудоў пшаніцы. Украінскае правае узьбярэжжа з яго вялізарнымі рэзэрвуарамі рабочай сілы, зьяўляецца базай для інтэнсыўнай сельскай гаспадаркі. Але, ажыцьцяўляючы задачы сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі, партыі на Украіне прыходзіцца стыкацца з асабліва лютым супраціўленьнем кулака, які мае за сабой значную эканамічную моц і палітычны вопыт, пры чым цяжкасьці барацьбы з кулаком ускладняюцца нацыянальным пытаньнем. Пленум адобрыў работу украінскай партарганізацыі ў вёсцы, якую досыць характэрызуе факт пасьпяховага датэрміновага сканчэньня хлебазагатовак на Украіне.

Вялізарнае значэньне ў справе далейшай працы партыі на фронце сельскае гаспадаркі мае пастанова пленуму аб заснаваньні Саюзнага Наркамзему. Арганізацыя Саюзнага Наркамзему дыктуецца побач з асноўнай яго задачай—кіраўніцтвам хутка ўзрастаючым буйным сацыялістычным земляробствам—таксама задачай паскарэньня працэсу ўздыму і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі ў адсталых нацыянальных рэспубліках пры дапамозе ўсяго Саюзу. Пленум абмеркаваў праэкт аб кадрах, які мае вялікае значэньне ў сучасны момант, калі тэмпы будаўніцтва сацыялізму выстаўляюць вялізарныя патрабаваньні на спэцыялістаў, з аднаго боку, і калі, з другога боку, абвостраная клясавая барацьба кінула вядомую частку старых спэцыялістаў у лягер актыўных ворагаў сацыялістычнага будаўніцтва, якіх трэба замяніць новымі кадрамі.

Да гэтага часу мы надзвычайна слаба пасоўваліся ўперад з вырашэньнем пытаньня аб кадрах. Зараз больш хуткае практычнае правядзеньне мер, намечаных пленумам у справе падрыхтоўкі кадраў, робіцца адной з самых балвых задач партыі.

Асабліва вялікае значэньне набывае падрыхтоўка інжынэраў для мэталюргіі, агранома́ў для аграмаждзанага сэктару сельскае гаспадаркі і падрыхтоўка сярэдняга тэхнічнага пэрсаналу. Пэрыяд пасьля XVI-й канфэрэнцыі і лістападаўскага пленуму з выключнай яскравасьцю і вачавіднасьцю сьцьвердзіў правільнасьць генэральнай лініі партыі. Не выпадкова, што ён стаў поўным развалам трацкізму, які на працягу многіх год вёў упартую барацьбу супроць палітыкі нашай партыі. І гэты самы-ж пэрыяд выкрыў перад партыяй і перад шырокімі масамі анты-ленінскую, анты-бальшавіцкую, па зьместу буржуазна-лібэральную сутнасьць правага ўхілу на чале з тав. Бухарыным. Ухіл гэты да пленуму ЦК у сакавіку афармі́ўся ў поўную сыстэму поглядаў, у аспове адышоў ад генэральнай лініі партыі. Менавіта таму пленум прызнаў прапаганду поглядаў правага апартунізму і прымірэнцтва з ім несумяшчальнай прыналежнасьцю да УсеКП(б). Анты бальшавіцкі, антыленінскі характар бухарынскай апазыцыі і безнадзейнае банкроцтва яе лініі перад суровай праверкай фактаў сталі відавочнымі для ленінай часткі самой бухарынскай групы.

Яшчэ пры абгаварэньні першага пункту парадку дню пленуму быўшы другі сэкратар МК тав. Котаў заявіў аб сваім адыходзе ад апазыцыі. Заяву аб бязумоўным прызнаньні генэральнай лініі партыі зрабіў ў той жа час і тав. Міхайлаў. Перад самым зачыненьнем пленуму рашуча адмежаваліся ад бухарынскай апазыцыі т. т. Угланаў і Кулікаў. Гэткім чынам ад апазыцыі адыйшло ўсё ядро старога маскоўскага кіраўніцтва. Аднак правадыры правых ухілістаў працягваюць чапляцца за свае асуджаныя партый погляды. Няшчыра заяўляючы аб згодзе з генэральнай лініяй партыі і аб зьяўленьні разнагалосьсяў, прызнаючы сьледам за буржуазнымі карэспадэнтамі і лібэральнымі эканамістамі посьпехі партыі, правадыры правых ухілістаў на чале з Бухарыным у той жа час дазваляюць сабе дэмагагічна абвінавачваць партыю ў невыкананьні пляну нашырэньня пасеву і г. д. Працягваюць лічыць правільнымі свае вясенныя рацэпты (імпарт хлеба, падвышэньне цэн на сельска-гаспадарчыя прадукты) і пад выглядам адмены надзвычайных мер фактычна патрабуюць ад партыі спыненьня наступу на кулака. Правадыры правых ухілістаў ня толькі не бяруць назад сваіх ранейшых абвінавачаньняў супроць партыі (ваенна-фэадальная эксплёатацыя, насаджэньне бюракратызму і г. д.), але даюць да іх новыя абвінавачаньні, якія перавышаюць усякія межы па сваёй фальшывасьці і паклёпніцкаму характару. Яны заяўляюць, напрыклад, што партыя і Камінтэрн абарачялі тэорыю ўрастаньня кулака ў сацыялізм. Двурушніцкая тактыка правадыроў правых ухілістаў ня можа быць расцэнена партыяй інакш, як ужываемы ўжо нераз трацкісцкі манэўр, як часовае адступленьне для таго, каб напасьці на партыю пры першых жа цяжкасьцях. Так яе і расцэніў пленум ЦК.

Прызнаўшы прапаганду правага апартунізму і прымірэнцтва з ім несумяшчальнай прыналежнасьцю да УсеКП(б), пленум ЦК пастанавіў вывесьці з Палітбюро галоўнага лідэра і натхніцеля правых ухілістаў тав. Бухарына. Малейшыя спробы працягваць барацьбу супроць лініі партыі пямінуча павядуць за сабой далейшыя арганізацыйныя меры. Прызнаўшы неабходным працягваньне бязьлітаснай барацьбы з правай апазыцыяй, Пленум выказаўся адначасова за рашучаю перамогу «левых» настрояў, якія выяўляліся ў паасобных праслойках партыі, таксама як і прымірэнцкія адносіны да іх.

Даючы выразны адказ на асноўныя запросы бягучай палітыкі, рашэньні лістападаўскага пленуму адыграюць вялікую ролю ў справе далейшага згуртаваньня партыі на аснове яе генэральнай ленінскай лініі і ў вырашэньні вялізарных задач, якія стаяць перад партыяй на сучасным этапе сацыялістычнага наступу (з перадавіцы «Правды»).

СХОД ПАРТАКТЫВУ.

Сёньня, 19-га лістапада, а 6 гадзіне ўвечары, у доме Партвоты (былы клюб Карла Маркса) адбудзецца сход менскага партактыву.

ПАРАДАК ДНЮ:

Даклад сэкретара ЦК КП(б)Б тав. ВАСІЛЕВІЧА аб выніках чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б).

Сходы па райкомах Менскага АК.

Рашуча патрабуем ад лідэраў правай апазіцыі адмовіцца ад антыленінскіх, апартуністычных поглядаў

РЭЗАЛЮЦЫЯ БЮРО ЦК КП(б)Б

аб пастановах пленуму ЦК УсеКП(б) аб правай апазіцыі.

Фракцыйныя вылазкі правых апартуністых, упартая абарона і прапаганда імі анты-ленінскіх, анты-бальшавіцкіх, па сутнасьці буржуазна-лібэральных тэорый і поглядаў правай апазыцыі, якая вазглаўляецца тав. Бухарыным, сьведчаць аб тым, што правыя сталі на шлях непасрэднай барацьбы супроць партыі і яе ленінскага ЦК.

Паводзіны т. т. Бухарына, Рыкава, Томскага на толькі што адбыўшымся пленуме ЦК УсеКП(б) гавораць аб тым, што лідэры правай апазыцыі замест рашучага адмаўленьня ад сваіх апартуністычных поглядаў, заняли двурушніцкую пазыцыю.

Лісамерка заявіўшы аб сваёй згодзе з лініяй партыі, лідэры правых ухілістых ня толькі не адмовіліся ад сваіх ранейшых абвінавачваньняў супроць партыі (ваенна фэадальная эксплёатацыя, скатываньне да ваеннага камунізму, насаджэньне бюракратызму і г. д.), але яшчэ нахабна дадалі новыя абвінавачваньні, якія пераходзяць усякія межы па сваёй ілжывасьці.

Гэтае двурушніцтва правадыроў правай апазыцыі ня можа быць расцэнена партыяй інакш, як ужо добра знаёмы партыі па барацьбе з трацкістымі манэўр, пры дапамозе якога правая апазыцыя прабуе часова адступіць для таго, каб пры першых-жа цяжкасьцях зноў атакаваць партыю.

Пленум ЦК УсеКП(б) выкрыў гэты манэўр правай апазыцыі, даўшы рашучы адпор двурушніцкім выступленьням лідэраў правай апазыцыі.

Магутны рост актыўнасьці рабочае клясы, батракоў і бядняка-серадняцкіх мас сялянства, які знайшоў сваё вырашэньне ў сацыялістычным спаборніцтве, у арганізацыі ўдарных брыгад цэхаў заводаў, у арганізацыі калгасаў гігантаў і раёнаў сплошной калектывізацыі, нашы вялізарнейшыя посьпехі ў справе індустрыялізацыі і сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі — дашчэнту разьбілі ўсе прароцтвы і тэорыі правых апартуністых, выявіўшы поўнае палітычнае банкруцтва правай апазыцыі і яе ідэолёгаў на чале з тав. Бухарыным.

Толькі дзякуючы ленінскаму кіраўніцтву бальшавіцкага ЦК УсеКП(б), толькі на аснове няўхільнага і цьвёрдага выкананьня генэральнай лініі партыі мы дабіліся гэтых вялізарнейшых посьпехаў.

Бюро ЦК КП(б)Б поўнасьцю і цалкам далучаецца да рашэньня пленуму ЦК УсеКП(б) аб правай апазыцыі, аб вывадзе тав. Бухарына са складу Палітбюро ЦК і аб папярэджваньні другіх правых апазіцыянэраў (Рыкаў, Томскі).

Бюро ЦК КП(б)Б са ўсёй катэгарычнасьцю заяўляе, што прапаганда анты-ленінскіх поглядаў і далейшае вядзеньне фракцыйнай барацьбы супроць партыі з боку правых укланістых не сумяшчальна з прабываньнем у радах партыі.

Бюро ЦК КП(б)Б ад імя ўсёй КП(б)Б папярэджвае, што малейшыя спробы з боку правых апазыцыянэраў настойваць на сваіх памылковых поглядах, працягваць сваю памылковую лінію і барацьбу супроць партыі, павінна павесьці за сабой прымяненьне да іх самых рашучых арганізацыйных вывадаў.

Бюро ЦК КП(б)Б прызывае ўсе арганізацыі КП(б)Б яшчэ больш згуртаваць свае шэрагі вакол бальшавіцкага ЦК, які цьвёрда стаіць на варце жалезнага адзінства ленінскіх радоў нашае партыі.

КП(б)Б, як адзін з баявых атрадаў УсеКП(б), яшчэ больш узмацніць сваю барацьбу супроць усякіх ухілаў ад ленінскай лініі партыі, з асабліваю сілаю завастраючы гэтую барацьбу супроць правага ўхілу і прымірэнцтва, не паслабляючы барацьбы супроць „левых" загібаў і настрояў.

Нахай жыве Ленінскі ЦК УсеКП(б)!

Пастанова

Бюро Фрунзаўскага РК КП(б)Б ад 18-XI-29 г.

1. Бюро Фрунзаўскага РК КП(б)Б заслухаўшы інфармацыю аб апошнім Пленуме ЦК УсеКП(б), цалкам далучаецца да пастановы Пленуму.

2. Бюро РК цалкам адабрае пастанову Пленуму аб вывадзе з складу Палітбюро ЦК лідэра правай апазіцыі тав. Бухарына.

3. Бюро РК ад імя ўсёй Фрунзаўскай партарганізацыі далучаецца да пастановы Пленуму ЦК аб папярэджаньні астатніх лідэраў правай апазіцыі і патрабуе ад іх бязумоўнага адмаўленьня ад сваіх анты-ленінскіх апартуністычных поглядаў.

4. Бюро РК заклікае ўсю Фрунзаўскую партыйную арганізацыю яшчэ больш рашуча змагацца з капітулянцкімі, анты-ленінскімі, апартуністычнымі поглядамі і фракцыйнымі вылазкамі правай апазіцыі.

РЭЗАЛЮЦЫЯ БЮРО АКРУГКОМУ КП(б)Б

па пытаньню аб пастановах апошняга Пленуму ЦК УсеКП(б).

Заслухаўшы паведамленьне аб пастановах апошняга Пленуму ЦК УсеКП(б) па пытаньню аб групе правых ухілістых, на чале з тав. Бухарыным, Бюро Менскага Акругкому КП(б)Б цалкам далучаецца да пастановы Пленуму і лічыць зусім правільным вывад ідэалёга правага ўхілу т. Бухарына з Палітбюро ЦК, а таксама папярэджаньне інш. таварышоў (Рыкаў, Томскі) у тым, што ў выпадку найменшай спробы з іх боку працягваць барацьбу супроць лініі і рашэньняў ЦК УсеКП(б), партыя неадкладна прыме супроць іх арганізацыйныя захады.

Партыя за апошні час неадноразова звараталася да правай апазыцыі з прапановай аб адмаўленьні ад права-апартуністычнай ідэалёгіі і сьпыненьні фракцыйнай дзейнасьці супроць партыі.

Ня гледзячы на гэта, правыя фракцыянэры яшчэ больш узмацнілі змаганьне з партыяй, аб чым сьведчаць апошнія выступленьні прадстаўнікоў школы Бухарына (Сьляпкоў, Айхенвальд і інш.) ў яч. Пром. Акадэміі, ІЧП, Казанскім Інстытуце, у Варонежы і інш., якія фармальна згадзіліся з лініяй партыі і адначасова супрэчаць супроць пастаноў ВККІ аб Бухарыне і салідарызуюцца з антыленінскімі рэзізанісцкімі дакумэнтамі і выступленьнямі Бухарына.

Менская арганізацыя вяла ўвесь час рашучае змаганьне з права-ўхілісцкімі тэорыямі і практычнымі праяўленьнямі правага ўхілу (справа Наркамзему, Наркамасьветы, Белсамтрамсаюзу і інш.). Менская арганізацыя надалей будзе серавным правадніком генэральнай Ленінскай лініі ЦК УсеКП(б) і будзе змагацца як з правым ухілам, так і з рэцэдывамі трацкісцкіх настроў у выглядзе поўтрацкісцкіх „левых" загібаў і прымірэнцтвам да іх.

НАХАЙ ЖЫВЕ ЛЕНІНСКІ ЦК УсеКП(б).

Рэзалюцыя яч. ЦВК і СНК

Агульны сход ячэйкі КП(б)Б ЦВК, СНК і Дзяржпляну, заслухаўшы інфармацыю тав. Корфа аб рашэньні Пленуму ЦК УсеКП(б) наконт групы правых укланістых, партыйнатыў цалкам і поўнасьцю адабрае рашэньне Пленуму аб вывадзе ідэолёга правага ўхілу тав. Бухарына з складу палітбюро ЦК УсеКП(б), і тое папярэджаньне якое дано астатнім лідэрам правай апазіцыі (Рыкаў, Томскі).

Ня гледзячы на тыя вялікія дасягненьні ў сацыялістычным будаўніцтве, якія мы маем дзякуючы валіраку энтузіязму рабочае клясы і асноўных мас сялянства, правыя апартуністы яшчэ не пераканаліся ў правільнасьці генэральнай лініі партыі і ня спыняюць сваю фракцыйную дзейнасьць, якая перашкаджае нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву і наступленьню на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі.

Агульны сход патрабуе прыняцьця самых рашучых арганізацыйных мер да правых ухілістых пры малейшай спробе з іх боку працягваць барацьбу супроць лініі і рашэньняў ЦК УсеКП(б).

Агульны сход запэўнівае Ленінскі ЦК УсеКП(б), што будзе надалей, як і да гэтай пары, рашуча змагацца з правымі ухілам у тэорыі і практыцы, рашуча праводзіць генэральную лінію партыі, якая поўнасьцю адпавядае інтарэсам рабочае клясы — будаўніцтву сацыялізму. Яшчэ больш упарта змагацца і бюракратызмам, валакітай і іншымі адмоўнымі зьявішчамі ў нашым апараце, уздымаць інтэнсыўнасьць працы, эканоміць сродкі, якія пойдуць на далейшую індустрыялізацыю краіны і калгаснага і саўгаснага будаўніцтва.

Аб кантрольных лічбах народнай гаспадаркі СССР на 1929-30 г.

Рэзалюцыя па дакладах Кржыжаноўскага і Куйбышава, ухваленая пленумам ЦК УсеКП(б) 17 лістапада 1929 г.

Вынікі мінулага гаспадарчага году, які праходзіў пад знакам бурнага росту сацыялістычнай індустрыі і сацыялістычных элементаў у народнай гаспадарцы, сьведчаць аб новых буйнейшых дасягненьнях рабочае клясы, савецкай улады і партыі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва. Плян першага году пяцігодкі ў асноўным выкананы з перавышэньнем заданьняў пяцігадовага пляну па раду важнейшых галін народнай гаспадаркі. Прадукцыя буйнай сацыялістычнай прамысловасьці ўзрасла на 23,7 проц. (супроць 21,4 проц. па пяцігадоваму пляну), у тым ліку прадукцыя галін прамысловасьці, якія вынішчаюць сродкі вытворчасьці, узрасла на 29,8 проц. (супроць 25,6 проц. па пяцігадоваму пляну). Магутнасьць электрастанцый узрасла на 20,3 проц. (супроць 14 проц. па пляну). Грузазварот чыгунак узрос на 21 проц. (супроць 10,1 процантаў па пляну). Гэты, перавышаючы заданьні пяцігадовага пляну, рост кіруючых галін народнай гаспадаркі, поруч з далейшым ростам індустрыяльнага пралетарыяту (7,8 проц.), умацаваньнем яго клясавых пазіцый, ростам палітычнай актыўнасьці, абумовіў іх грунтоўны зрух у справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, які (зрух) выявіўся ў бурным росьце калгасаў, на аснове актыўнага ўдзелу бяднацка-серадняцкіх мас сялянства ў справе сацыялістычнай перабудовы вёскі. У выніку тэмп калектывізацыі сельскай гаспадаркі значна перавялічыў праэктаваньне пяцігадовага пляну.

Агульная колькасьць сялянскіх гаспадарак, уцягнутых у калгасы, узрасла з 445 тысяч у 1927-28 г. да 1040 тысяч у 1928-29 г. (супроць 554 тысяч па пяцігадоваму пляну). Пасеўны абшар калгасаў узрос з 1,4 міліёну гэктараў у 1927-28 г. да 4,3 міліёнаў гэктараў у 1928-29 г., або на 206,7 проц. (супроць 137,4 па пяцігадоваму пляну), валавая прадукцыя ўзрасла на 240,5 проц. і таварная прадукцыя—на 278,3 проц. Удзельная вага калгасаў ва ўсёй таварнай прадукцыі сельскай гаспадаркі ўзрасла з 1,4 проц. у 1927-28 г. да 4,9 проц. у 1928-29 г., у тым ліку па зернавых хлябох з 4,5 проц. да 12,9 пр. Гэты нябывалы тэмп калектывізацыі, які перавялічвае самыя аптымістычныя праэктаваньні, сьведчыць аб тым, што на калектывізацыю пайшлі ўслед за бяднацкімі гаспадаркамі вёскі сапраўдныя масы серадняцкіх гаспадак, якія пераконваюцца на практыцы ў перавазе калектыўных форм земляробства.

Рашучы пералом у адносінах бяднацка-серадняцкіх мас да калгасаў, які зьяўляецца непасрэдным вынікам правільнай палітыкі рабочае клясы і партыі на вёсцы, узмацненьне кіруючай ролі рабочае клясы ў яго саюзе з бяднацка-серадняцкім сялянствам, магутным ростам сацыялістычнай індустрыі і нашырэньнем вытворчых форм сувязі—значае новы гістарычны тэмп у справе будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне. Адначасна вялічэзнымі тэмпамі калектывізацыі самыя буйныя посьпехі будуць дасягнуты і ў галіне будаўніцтва калгасаў і машынатрактарных станцый. Засэўны абшар у савгасах з вясны 1929 г. павялічыўся на 27,5 проц. (замест 26,3 проц. па пляну) і валавая прадукцыя зернавых хлябоў на 34,7 проц. У выніку па ўсім аграмаждзаным сэктары сельскай гаспадаркі валавая прадукцыя дасягнула ў 1928-29 г. 612,8 міліёнаў (супроць 283,2 міліёнаў руб. у 1927-28 г.) і таварная прадукцыя—263,9 млн. р. (супроць 134,5 міліёнаў руб. у 1927-28 г.). Удзельная вага яго, аграмаждзанага сэктару, у валавым зборы зернавых хлябоў узрасла за год з 2,5 пр. да 5,8 проц. (замест намечаных па пляну 4,9 проц.), а ў таварным зборы зернавых з 12,2 проц. да 21 пр. Агульны рост прадукцыйнага засеўнага абшару (5 проц.), хоць і некалькі адсталы ад плянавых заданьняў, быў забясьпечан ростам засеваў у аграмаждзаным сэктары і бяднацка-серадняцкіх гаспадарках вёскі, перагнаўшым скарачэньне пасеўных абшараў у кулацкіх і заможных гаспадарках.

Рост засеўных абшараў, валавой і таварнай прадукцыі сельскай гаспадаркі, рост кантрактацыі і павялічэньне таварнай прадукцыі і ўдзельнай вагі аграмаждзанага сэктару, пры адначасным напружаньні яго партыйнага, савецкага і каапэрацыйнага апарату ў справе хлебазагатовак, пашырэньне арганізацый бедноты і серадняцтва для барацьбы за поўнае выкананьне пляну і пераможаньне кулацкага супраціўленьня і сабатажу, узмацненьне рэпрэсій супроць хлебнай спэкуляцыі і ўтоеньне кулакамі хлебных лішкаў, налепшаньні забясьпекі вёскі прамтаварамі і г. д.—забясьпечылі спрыяючы рост хлебазагатовак, які значна перавышае вынікі мінулых гадоў і дае магчымасьць ужо сёлета стварыць запас да 100 міліёнаў пудоў хлеба. Удзельная вага аграмаждзанага сэктару народнай гаспадаркі ў цалым узрасла: па капітала-ўкладах з 55,2 проц. да 65,2 проц., па асноўных фондах з 51,7 да 54,1 проц. і па валавой прадукцыі з 41,7 проц. да 43,5 проц.

У непасрэднай процілегласьці з забясьпекаю рабочае клясы ў капіталістычных краінах, мінулы год характарызаваўся далейшым паленшаньнем матар'яльнага становішча рабочай клясы: ростам рэальнага заработку (хоць адсталага крыху ад пляну), пераходам у гэтым годзе 500 тысяч рабочых на 7-мігадзінны дзень працы і далейшым ростам матар'яльнага і культурнага абслугоўваньня рабочай клясы (кватэрнае будаўніцтва, сацыяльнае страхаваньне і г. д.).

Рост народнай гаспадаркі і яе сацыялістычнага сэктару абумоўлен ростам творчай актыўнасьці шырокіх мас рабочай клясы, які выявіўся ў сацыялістычным спаборніцтве, разгортваньні самакрытыкі, правядзеньні дню індустрыялізацыі, шырокай падпісцы на пазыку індустрыялізацыі, якая значна перавысіла агульную суму выпуску пазыкі і г. д. Ажывілася на аснове далейшага пашырэньня сувязі з шырокімі масамі працоўных праца па арганізацыі рабочай клясы (партыйныя арганізацыі, прафсаюзы, саветы), якая перабудоўвае спосабы і мэтады сваёй працы, усё ў большай ступені паварачваецца тварам да вытворчасьці, тварам да непасрэдных гаспадарчых задач сацыялістычнага будаўніцтва. Адначасна ўзрасло абвастрэньне клясавых адносін кулака на вёсцы, нэпмана ў горадзе, шкодніка на вытворчасьці. Гэтыя вынікі мінулага гаспадарчага году поўнасьцю падцьвердзілі правільнасьць усёй палітыкі партыі і канчаткова даказалі поўнае банкроцтва пазіцыі правых ухілістаў (група т. Бухарына), якія зьяўляюцца выразьнікамі выяўленьня нажыму дробна-буржуазнай стыхіі, перапудам перад абвостранай клясавай барацьбой, капітулянцтвам перад цяжкасьцямі сацыялістычнага будаўніцтва.

Правыя завярэлі наконт „дэградацыі" сельскай гаспадаркі. На справе мы мелі далейшы рост бяднацка-серадняцкіх гаспадарак, агульны рост засеўных абшараў, рост забясьпекі машынамі і павялічэньне матар'яльна-тэхнічнага і аграномічнага ўзроўню разьвіцьця сельскай гаспадаркі. Правыя завярэлі наконт нібыта існаваўшай „размычкі" бяднацка-серадняцкіх мас з рабочаю клясаю. На справе-ж мы маем далейшае замацаваньне сувязі рабочай клясы з сялянствам, пашырэньне і ўзмацненьне ў гэтым саюзе кіруючай ролі пралетарыяту, што выявілася ў бурным росьце калектывізацыі і будаўніцтва калгасаў. Правыя прарочылі няўхільнасьць прывозу хлеба. На справе мы мелі такі рост хлебазагатовак, які забясьпечыў краіну хлебам свайго ўраджаю і нават стварэньне запаснага хлебнага фонду ў дзесяткі міліёнаў пудоў пры актыўным гандлёвым балансе і накапленьні валюты. Правыя завіраюць аб невыкананьні ўзятых тэмпаў індустрыялізацыі краіны.

На справе-ж мы ня толькі выканалі, але і ў значнай меры перавыканалі плянавыя заданьні. Правыя заяўлялі аб нерэальнасьці ўзятых тэмпаў калектывізацыі і будаўніцтва саўгасаў, аб адсутнасьці неабходных матар'яльна-тэхнічных умоў і аб нежаданьні бяднацка-серадняцкага сялянства пераходзіць да калектыўных форм земляробства.

На справе-ж мы маем такі бурны рост калектывізацыі, такую вялікую цягу бяднацка-серадняцкіх гаспадарак да сацыялістычных форм гаспадаркі, што калгасны рух ужо распачаў на практыцы пераароджвацца ў сплошную калектывізацыю цэлых раёнаў. Гэта сьведчыць пра новы этап, новую паласу, пераходную эпоху ад капіталізму да сацыялізму.

Правыя ня вераць у творчыя сілы рабочай клясы. Патрабавалі раўняцца на „вузкія месцы",

Рэзалюцыя па дакладах Кржыжаноўскага і Куйбышава,

ухваленая пленумам ЦК УсеКП(б) 17 лістапада 1929 г.

(Працяг)

рост вытворчых сіл у напрамку да сацыялізму. Правыя завяралі ў няўхільнасьці агульнага гаспадарчага крызісу, г. зн. аб парушэньні нармальнага ходу вытворчасьці і яе абнаўленьня. Пэ справе-ж мы маем такі рост вытворчасьці, такое паскораньне тэмпу, аб якім мы раней марыць не маглі і які дае нам магчымасьць абярнуць на справе максымальны тэмп пяцігадовага пляну ў мінімальны. Толькі рашуча перамагаючы спробы правых апартуністаў, якія аб'ектыўна зьяўляюцца рупарам гаспадарчых і палітычных інтарэсаў дробна-буржуазнай стыхіі і кулацка-капіталістычных груп зьвярнуць партыю з генэральнай лініі нашага разьвіцьця, рабочая кляса і партыя маглі дамагчыся да значнага кроку наперад у справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Дасягнутыя посьпехі ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва няўхільна праходзяць пры вядомых цяжкасьцях, абвастрэньнях супраціўленьня капіталістычных элемэнтаў. Як і раней, адною з галоўных задач гаспадарчай палітыкі партыі зьяўляецца перамоганьне празьмернага адставаньня тэмпаў разьвіцьця сельскай гаспадаркі і, між іншым, асабліва яго зернавога і жывёлагадоўчага сэктараў. Радыкальнае вырашэньне гэтай задачы ляжыць на шляхох далейшага фарсіраваньня працэсаў калектывізацыі і будаўніцтва савгасаў, на шляхох далейшага паленшаньня і ўзмацненьня саміх калгасаў, нарэшце, на шляхох фарсіраванага разьвіцьця індустрыі, якая зьяўляецца базай сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Асаблівую ўвагу ў сёлетнім гаспадарчым годзе згр паваць на пасьпяхоўным правядзеньні веснавой пасяўной сельска-гаспадарчай кампаніі Узрастаючай цягі шырокіх мас бядняцка-серадняцкіх гаспадарак да калектыўных форм земляробства, асноўнаю цяжкасьцю ў справе вырашэньня гэтай вялічэзнай гістарычнай задачы зьяўляецца адставаньне галіны прамысловасьці, якія абслугоўваюць у вытворчых адносінах сельскую гаспадарку. Адставаньне машыны, трактара, угнаеньня ад рэальных тэмпаў калектывізацыі і будаўніцтва савгасаў. Як і раней, гэтым ростам як для сельскай гаспадаркі, так і для прамысловасьці зьяўляецца хімічная прамысловасьць, тэмпы разьвіцьця якой значна адстаюць аб патрэб народнай гаспадаркі. Яўная дыспрапорцыя захоўваецца між патрэбамі народнай гаспадаркі і разьмерамі вытворчасьці машынабудаўнічай прамысловасьці, не зважаючы на высокія тэмпы разьвіцьця апошняй.

Вельмі значныя цяжкасьці застаюцца і ў галіне забясьпечкі краіны палівам, чорнымі і каляровымі мэталямі, дэфіцытнасьць якіх абцяжарвае ажыцьцяўленьне намечаных тэмпаў разьвіцьця машынабудаўніцтва і ў галіне максымальна тэхнічнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Ня гледзячы на буйнейшыя посьпехі па экспарту прамтавараў і „другарадных рэчаў" экспарту, вельмі востра стаіць задача фарсіраванага разьвіцьця экспартных галін народнай гаспадаркі, і перш-на-перш лясного экспарту, недастатковы курс разьвіцьця якіх затрымлівае і абцяжарвае выпуск неабходных краіне машын, паўфабрыкатаў і сыравіны для прамысловасьці. Застаецца яшчэ адно з «вузкіх» месц народнай гаспадаркі, транспартна шляхавая праблема.

2. Вялікія дасягненьні ў справе сацыялістычнага будаўніцтва за мінулы год, уцягненьня новых рэзэрваў рабочай клясы ў справу сацыялістычнага спаборніцтва і ўвядзеньня „бесперапынкі", і бяручы пад увагу паварот, які намеціўся ў асноўных мас сялянства да калгаснага руху, пленум ЦК прадугледжвае наступны канкрэтны плян народна-гаспадарчага разьвіцьця на 1929 30 год:

а) капітальныя ўклады ў народную гаспадарку павінны дасягнуць каля 13 міліярдаў рублёў (супроць 8 з паловаю міліярдаў у 1928-29 годзе і 8,2 міліярдаў па пяцігадоваму пляну), у тым ліку ў плянуемую прамысловасьць і электрафікацыю 4 міліярды рублёў (супроць 2,8 міліярдаў рублёў па пяцігадоваму пляну), у транспарце—1,9 міліярдаў рублёў (супроць 1,6 міліярдаў рублёў па пяцігадоваму пляну) і сельскую гаспадарку—4,3 міліярдаў рублёў (супроць 3,5 міліярда рублёў па пяцігадоваму пляну). Між іншым, у аграмаджаны сэктар сельскай гаспадаркі ўклады павінны складаць 1,6 міліярда рублёў (супроць 0,6 міліярда рублёў па пяцігадоваму пляну). Уклады на асьвету павінны скласьці 646 міліёнаў рублёў супроць 336 міліёнаў мінулага году.

б) Асноўныя фонды народнай гаспадаркі павінны ўзрасьці з 73,7 міліярдаў рублёў у 1928-29 годзе да 85,2 міліярдаў рублёў у 1929-30 годзе, або на 14,4 проц. (супроць 7,2 проц. прыросту асноўных фондаў 1928-29 году). Асноўныя фонды прамысловасьці і электрафікацыі павінны разрасьціся з 12,8 міліярдаў рублёў у 1928-29 годзе да 17,5 міліярдаў рублёў у 1929-30 годзе, або на 37,1 пр., а удзельная вага іх асноўных фондаў у народнай гаспадарцы—з 17,1 проц. у 1928-29 г. да 20,1 проц. Асноўныя фонды транспарту павінны ўзрасьці з 12,7 міліярдаў рублёў да 14,5 міліярдаў рублёў або на 14 проц. і сельскай гаспадаркі з 30 міліярдаў руб. да 31,8 міліярдаў р., або на 5 проц.

в) Рост капітальных укладаў і асноўных фондаў народнай гаспадаркі павінен забясьпечыць значны рост прадукцыі. Валавая прадукцыя ўсёй прамысловасьці павінна ўзрасьці з 22,3 міліярдаў рублёў у 1928-29 г. да 28 міліярдаў рублёў у 1929-30 годзе (25,3 проц.). Валавая прадукцыя плянуемай прамысловасьці павінна ўзрасьці з 13,7 міліярдаў рублёў у 1928-29 годзе да 18,1 міліярдаў рублёў у 1929-30 годзе, або на 32,1 проц. (супроць 21,5 па пяцігадоваму пляну), у тым ліку па галінах, якія даюць сродкі вытворчасьці, на 45,1 проц., што поўнасьцю адпавядае ідэі індустрыялізацыі краіны, павялічэньню яе абароназдольнасьці і росту яе незалежнасьні ад капіталістычнага сьвету. З гэтае прычыны, ужыўшы ўсе захады да магчымага павялічэньня прадукцыі ў параўнаньні з намечаным плянам, да разьвіцьця ў галіне вугалю, чорных і каляровых мэталяў, трэба павесьці рашучую барацьбу з неашчадным выдаткаваньнем гэтых дэфіцытных матар'ялаў.

Валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі ў 1930 годзе ў параўнаньні з 1929 г. павінна ўзрасьці на 13 проц. Сельска-гаспадарчая пасеўная кампанія 1930 году павінна забясьпечыць рост прадукцыйнага абшару на 10,5 проц., у тым ліку пад зернавыя культуры на 10 проц., рост ураджайнасьці зернавых культур—на 8 проц., што павінна даць павялічэньне агульнага збору зернавых культур на 16,6 проц. Адпаведныя зрухі ў галіне засеўных абшараў і ўраджайнасьць тэхнічных культур і пашырэньня пасеўнай сыстэмы, зьмены тэхнікі апрацоўкі глебы, павялічэньня выпуску мінэральных угнаеньняў, павінна гарантаваць пашырэньне прадукцыі бавоўны на 108,7 проц., лёну на 13,5 проц. і цукровых буракоў на 77 проц. Пашырэньне статку буйнай рагатай жывёлы намечаец а на 4,5 проц., коняй — на 3,5 проц. і дробнай жывёлы — на 10 проц. Грузазварот чыгунак павінен узрасьці з 106,7 міліярдаў тон-кілёмэтраў у 1928-29 годзе на 127 міліярдаў тон-кілёмэтраў у 1929-30 годзе або на 19,2 проц. (супроць 12,1 проц. па пяцігадаваму пляну). Народны прыбытак павінен будзе ўзрасьці з 28.534 міліёнаў рублёў у 1928-29 годзе да 34.363 міліёнаў рублёў у 1929-30 годзе або на 20,4 проц.

2) Агульны рост усёй народнай гаспадаркі павінен адбывацца разам з рашучым пашырэньнем усяго сацыялістычнага сэктару. Па асноўных паказчыках рост сацыялістычнага сэктара і павялічэньне яго ўдзельнай вагі ў народнай гаспадарцы павінны будуць складаць: у 1928-29 г. (у канцы году) 54,1, для 1929-30 59,0, валавая прадукцыя 43,5, таварная прадукцыя 69,9 а для 1929-30—75,4, гандлёва насрэдніцкі зварот 93,4, а для 1929-30 г. 96,9. 1929-30 год павінен быць годам вялікага і значнага кроку наперад у справе аграмаджаньня сельскай гаспадаркі. Засеўныя абшары савгасаў павінны ўзрасьці да 3,3 мільёнаў гэктараў супроць 1,8 міліёнаў гэктараў у 1928-29 годзе; адведна ў калгасах—да 15 міліёнаў гэктараў супроць 4,3 мільёнаў гэкт.

У 1929-30 годзе павінна ўліцца ў сельскую гаспадарку 40 тысяч трактараў, з ліку якіх павінна быць заспавана 102 машына-трактарныя станцыі, якія стваралі-б меры ўзьдзейнічаньня сацыялістычнага сэктару ў паўтары-два міліёны гэктараў і значна павінна быць узмоцнена трактарная база калектывізацыі савгасаў. Выкананьне гэтага пляну аграмаджаньня сельскай гаспадаркі павінна даць магчымасьць атрымаць ад аграмаджанага сэктару ўраджаю ў 1930 годзе больш 50 проц. таварнага хлеба па-за вясковага абароту (супроць 43 проц. таварнага хлеба, намечанага пяцігадавым плянам для ўраджаю 1933 году), што пры далейшым пашырэньні практыкі каптрыктацыі павінна азначаць зжыцьцё хлебных цяжкасьцяў і вырашэньня ў асноўным зарнавой праблемы.

д) Колькасная сіла наёмнай працы павінна ўзрасьці з 12,2 міліёнаў чалавек у 1928-29 годзе да 13,3 міліёнаў чалавек у 1929-30 годзе, або на 9,4 проц., у тым ліку індустрыяльнага і транспартнага пралетарыяту—з 5,9 міліёнаў чалавек да 6,5 міліёнаў чалавек або 10,2 проц. і сельска-гэспадарчых рабочых—з 2,1 міліёнаў чалавек да 2,3 міліёнаў чалавек, што значна перавышае арыентыроўку пяцігадовага пляну і тлумачыцца перавышэньнем арыентыроўкі пяцігодкі ў галіне матар'яльнай вытворчасьці культурнага будаўніцтва і, у прыватнасьці), увядзеньнем бесперапыннага вытворчага тыдню, шпаркім пераходам на 7-мігадзінны дзень працы, пераходам на шматзьменную працу і г. д. У сувязі з гэтым павялічэньнем вытворчасьці і культунага будаўніцтва новай рабочай сілы ня толькі спыніцца рост беспрацоўя, але абсалютна зьменшацца яго разьмеры.

е) Улічваючы адставаньне якасных паказчыкаў працы прамысловасьці (сабекошт прамысловай прадукцыі зьнізіўся на 4,5 проц.) і транспарту, якія не адпавядаюць вялічэзным капітальным укладам, і дасягнутыя паленшаньні якасьці прадукцыі, у 1929-30 годзе ў якасьці мінімальнага заданьня, павінна быць праведзена: зьніжэньне сабекошту прамысловай прадукцыі на 11 проц., кошту прамысловага будаўніцтва на 14 проц. і транспартнага будаўніцтва на 8 проц. пры абавязковым павышэньні тэхнічных зьмярыцеляў працы транспарту і паленшаньняў якасьці прамысловай прадукцыі. Галоўнай задачай бягучага гаспадарчага году і рашаючай умовай для выкананьня намечанага пляну разьвіцьця прамысловасьці павінна быць павялічэньне прадукцыйнасьці працы на 25 проц., пры росьце намінальнага заработку на 9 проц. і рэальнага ня менш, як на 12 проц.

ж) Чысты таваразварот усёй каапэрацыі будзе складаць 21.375 міліёнаў рублёў пры агульнай суме ўкладаў у каапэрацыю (без колгасаў) у 1.360 міліёнаў рублёў.

з) Дзяржаўны бюджэт на 1929-30 год павінен быць вызначан у разьмеры 11,3 міліярдаў рублёў (супроць 9,2 міліярдаў рублёў па пяцігадоваму пляну). Ва ўмовах агульнай напружанасьці ўсяго народна-гаспадарчага пляну выкананьне фінансавага пляну патрабуе вялічэзнай бюджэтна-пляпавай дысцыпліны, мабілізацыі ўсіх рэсурсаў і грашовых апчаднасьцяй насельніцтва з агульнага правядзеньня рэжыму эканоміі. Складанасьць і цяжкасьць пастаўленых перад намі задач у справе ажыцьцяўленьня гэтага вялічэзнага пляну гаспадарчага будаўніцтва патрабуе ад усёй рабочай клясы, усіх яе арганізацый, усёй партыі вялічэзнай увагі і вялічэзнай актыўнасьці, энэргіі і настойлівасьці ў пытаньнях практычнага ажыцьцяўленьня плянаў народна-гаспадарчага разьвіцьця. Той паварот прафэсыянальных саюзаў „тварам да вытворчасьці", які абазначыўся ў мінулым годзе, павінен быць замацован і ўзмоцнен у бягучым гаспадарчым годзе забясьпячэньнем бязумоўнага ажыцьцяўленьня дырэктывы ЦК аб устанаўленьні адзінаначальнасьці ва ўсіх гаспадарчых прадпрыёмствах (больш шырока павінна быць разгорнута праца максымальнага выкарыстаньня дасягненьняй сусьветнай навукі і тэхнікі, прыцягненьне чужаземнай тэхнічнай дапамогі і чужаземных спэцыялістаў, праца па тэхнічнай рэканструкцыі і ўсямернай рацыяналізацыі ўсіх бакоў гаспадарчага жыцьця.

Асаблівае значэньне набываюць шырокія рацыяналізатарскія мерапрыёмствы і прасоўваньне самых новых тэхнічных спосабаў і мэтадаў працы ў галіне прамысловага будаўніцтва, дзе ўдзельная вага новага будаўніцтва, кошт і тэрміны сканчэньня якога маюць буйнейшае значэньне з пункту гледжаньня вырашэньня некаторых задач сацыялістычнага будаўніцтва, узьнімаецца ў 1929-30 годзе да 46,7 пр. Павінен быць узяты такі тэмп у справе пераводу прадпрыёмстваў на бесперапынны тыдзень, каб да канца 1929-30 году ня менш двух трацін усёй дзяржаўнай прамысловасьці было пераведзена на бесперапынную вытворчасьць.

Задачы росту прамысловасьці і рост сацыялістычнага сэктару вёскі з нябывалай вострасьцю ставяць перад партыяй праблему кадраў, праблему тэхнічнай асьветы, праблему культурнага абслугоўваньня самых шырокіх рабочых і сялянскіх мас. 1929-30 год павінен быць годам рашучага выраўненьня ўсяго фронту сацыяльна-культурнай працы з новымі колькаснымі і якаснымі задачамі гаспадарчага будаўніцтва. Самая сур'ёзная ўвага павінна быць зьвернута на якасныя паказчыкі працы народнай гаспадаркі і, між іншым, асабліва на выкананьне намечанага росту прадукцыйнасьці працы і зьніжэньня сабекошту.

Пленум ЦК, падкрэсьліваючы бязумоўную абавязковасьць зьніжэньня сабекошту прамысловай прадукцыі на 11 процантаў, лічыць гэтае заданьне адною з галоўных дырэктыў усяго пляну гаспадарчага разьвіцьця на 1929-30 год, прычым гэтае зьніжэньне сабекошту павінна праводзіцца з абавязковым паленшаньнем якасьці прадукцыі. Абавязаць усе мясцовыя і партыйныя, савецкія і прафэсыянальныя арганізацыі ўжо ў першым кварталe разгарнуць такі тэмп працы для ажыцьцяўленьня гэтай дырэктывы, які поўнасьцю забясьпечыў-бы яе выкананьне. Пленум ЦК асабліва падкрэсьлівае важнасьць задачы забясьпячэньня росту рэальнага заработку ў 1929-30 годзе ня менш чымся на 12 проц., для чаго патрэбна прадоўжаньне курсу на зьніжэньне цэн на прамтавары і напружаная праца ўсіх савецкіх, прафэсыянальных, каапэрацыйных і партыйных арганізацый у справе лепшай арганізацыі забясьпекі прамысловых раёнаў харчовымі прадуктамі, у справе рацыянальнага выкарыстаньня і разьмеркаваньня харчовых рэсурсаў, паленшаньня хаваньня і перапрацоўкі харчовых прадуктаў, больш удасканаленай арганізацыі мясной і малочнай справы і г. д. Напружанасьць харчовага балянсу робіць гэтую задачу асабліва неабходнай і безадкладнай, магчымай быць выкананаю толькі пры мабілізацыі рабочай клясы і ўсіх яе арганізацый.

Падцьвярджаючы неабходнасьць выкананьня ўсяго хлебазагатоўчага пляну ў намечаныя тэрміны (г. зн. не пазьней студзеня), ЦК лічыць правільным давядзеньне хлебазагатоўчага пляну да вёскі і кулацкага двара і ўжыцьцё самых рашучых захадаў супроць кулацкага сабатажу і супраціўленьня выкананьня хлебазагатоўчага пляну. Падкрэсьліваючы, што ўвесь народна-гаспадарчы плян у цэлым можа быць выкананы толькі пры максымальнай актыўнасьці самых шырокіх рабочых мас працоўных і ў першую чаргу рабочай клясы, пры максымальным паленшаньні працы ўсяго гаспадарчага, савецкага, прафэсыянальнага і партыйнага апаратаў, пленум ЦК абавязвае ўсе арганізацыі партыі непаслабна праводзіць чыстку савецкага апарату ад бюракратычных і варожых рабочай клясе элемэнтаў і лічыць абсалютна неабходным далейшае ўзмацненьне барацьбы з бюракратызмам як у савецкіх, так і ў партыйных арганізацыях. Да справы барацьбы з бюракратызмам павінны быць прыцягнуты шырокія масы рабочых на базе далейшага разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі і пашырэньня практыкі вылучэньства. Пленум лічыць, што адначасна павінна быць узмоцнена барацьба як з бюракратычнымі спробамі абмежаваньня самакрытыкі, так і недапусьцімымі перахлёстваньнямі ў галіне самакрытыкі, якія даюць магчымасьць клясава-варожым элемэнтам выкарыстаць самакрытыку супроць партыі і дыктатуры пралетарыяту.

Асаблівая ўвага ў справе выкананьня задач сацыялістычнага будаўніцтва павінна быць зьвернута на сацыялістычнае спаборніцтва. Сацыялістычнае спаборніцтва павінна будзе зьявіцца адною з галоўных умоў выкананьня ўсяго пляну ў цэлым. Адзначаючы ўжо дасягнутыя ў галіне сацыялістычнага спаборніцтва посьпехі, ЦК адначасна адзначае, што кіраўніцтва гэтай працай яшчэ далёка не адпавядае вялічэзнаму значэньню гэтага новага фактара ў справе сацыялістычнага будаўніцтва. Вялікі ўздым і творчая ініцыятыва самых шырокіх працоўных мас ня маюць да гэтага часу таго кіраўніцтва, якое, дапамагаючы далейшаму разгортваньню сацыялістычнага спаборніцтва і ўцягненьню ў яго новых і новых сотняў тысяч рабочых, павінна павялічыць посьпехі і дасягненьні сацыялістычнага спаборніцтва. Пленум лічыць, што прафсаюзы павінны зьвярнуць на гэта асаблівую ўвагу і паказаць на справе, што яны зьяўляюцца магутнымі рычагамі сацыялістычнага будаўніцтва.

Буйнейшыя посьпехі апошніх гадоў, вялічэзны размах і нябачаныя тэмпы гаспадарчага разьвіцьця зьяўляюцца доказам таго, што задача савецкай улады дагнаць і перагнаць у тэхнічна-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны можа быць выкананa ў самыя кароткія гістарычныя тэрміны.

Бясспрэчная перавага савецкай сыстэмы гаспадаркі ў параўнаньні з капіталістычнай сыстэмай усё больш падцьвярджаецца ў выключна высокіх тэмпах народнагаспадарчага разьвіцьця, тэмпах матар'яльна-тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі і паленшаньні матар'яльнага і культурнага ўзроўню жыцьця рабочай клясы і працоўных мас сялянства.

Бурны рост сацыялістычных форм гаспадаркі, павялічэньне іх удзельнай вагі ў народнай гаспадарцы, павялічэньне іх уплыву на індывідуальную сельскую гаспадарку, якое выявілася ў стыхійным імкненьні бядняцка-серадняцкіх мас сялянства да калектыўных форм земляробства, — усё гэта сьведчыць аб тым, што рашучы посьпех палітыкі наступу сацыялізму на капіталістычныя элемэнты забясьпечан і што справа пабудаваньня сацыялізму ў краіне пралетарскай дыктатуры можа быць праведзена ў гістарычна мінімальныя тэрміны.

Цяжкасьці, якія ўзьнікаюць пры шпаркім тэмпе сацыялістычнага будаўніцтва, загартоўваючы волю і настойлівасьць рабочай клясы, уцягваюць у справу новыя сілы і новыя рэзэрвы пралетарскай рэвалюцыі, неабходныя для таго, каб перамагчы і і зьнішчыць гэтыя цяжкасьці. Адначасна абвастрэньне клясавай барацьбы і ўпартае супраціўленьне капіталістычных элемэнтаў наступаючаму сацыялізму ў варунках капіталістычнага абкружэньня нашай краіны павялічваюць пажым дробна-буржуазнай стыхіі на менш устойлівыя элемэнты партыі, параджаючы ідэалёгію капітулянцтва перад цяжкасьцямі, дэзэртырства, спробу згоды з кулацка-капіталістычнымі элемэнтамі гораду і вёскі. „Дробна-буржуазным дэмакратам улась-ціва агідпасьць да клясавай барацьбы, лятуценьні аб тым, каб абыйсьціся без яе, імкненьне згладзіць і замірыць, прытупіць вострыя рагі. З гэтае прычыны такія дэмакраты або адмоўчваюцца ад усякага прызнаньня новай гістарычнай паласы пераходу ад капіталізму да камунізму, або сваёй задачай лічаць высунуты плян замірэньня абедзьвюх сіл, якія змагаюцца, замест таго, каб кіраваць барацьбою аднэй з гэтых сіл» (Ленін, том 14, стар. 347-348).

Гэтая агідпасьць да клясавай барацьбы, «імкненьне згладзіць і замірыць, прытупіць вострыя вуглы», лятуценьні аб тым, каб абыйсьціся без клясавай барацьбы характэрны для ўсёй пазіцыі правых апартуністаў (група т. Бухарына).

Іменна адгэтуль бярэ свае асновы поўнае неразуменьне бухарынскай групай сучаснага абвастрэньня клясавай барацьбы, недаацэнка сілы супраціўленьня кулацка-нэпманскіх элемэнтаў, анты-левінская тэорыя аб «урастаньні» кулака ў сацыялізм, процідзеяньне палітыцы наступу на капіталістычныя элемэнты вёскі. Іменна тут тояцца асновы поўнага неразуменьня правымі ўхілістамі каапэрацыйнага пляну тав. Леніна, рашаючага значэньня калектыўных форм гаспадаркі і недаацэнка савгаснага будаўніцтва, патрабаваньні зьніжэньня тэмпаў індустрыялізацыі і паслабленьня вытворчых форм сувязі. Адмовіўшыся прызнаць сваю памылку ў пытаньнях гаспадарчай палітыкі, у пытаньнях індустрыялізацыі краіны, калектывізацыі сельскай гаспадаркі і савгаснага будаўніцтва, адмаўляючыся прызнаць свае памылкі ў ацэнцы і неразуменьні клясавай барацьбы, нарэшце, спрабуючы перайсьці да мэтадаў фракцыйнай барацьбы супроць партыі, бухарынская група канчаткова выкрывае сваю антыленінскую, антыбальшавіцкую сутнасьць.

У сувязі з гэтым, пленум ухваляе прызнаць прапаганду поглядаў правага апартунізму і прымірэнцтва да іх несумясьцімаю з прабываньнем у шэрагах УсеКП(б). Адначасна з павялічэньнем правай небясьпекі, выяўляюцца „левыя" заскокі ўсё той-жа дробна-буржуазнай стыхіі, антысерадняцкія настроі, трацкісцкія і паўтрацкісцкія наскокі на генэральную лінію партыі.

Падцьвярджаючы, што галоўнаю небясьпекаю застаецца правы ўхіл і прымірэнцтва з ім, ЦК абавязвае партыйныя арганізацыі ні ў якім разе не паслабляць барацьбы з «лева»-апартуністычнымі настроямі і цярпімымі адносінамі да такіх настрояў. Дасягненьні мінулага году будуць замацаваны рабочаю клясаю і партыяй у рашучай барацьбе з правым ухілам і „лева"-апартуністычнымі настроямі, незамірным выкрываньні рэштаў контр-рэвалюцыйнай трацкісцкай ідэалёгіі. Надыходзячыя перамогі сацыялізму ляжаць на тым самым шляху рашучага сыстэматычнага выкрываньня антыленінскай дробна буржуазнай сутнасьці правых і «левых» апартуністаў і прымірэнцтва да іх, і няшчадная барацьба з выяўленьнямі гэтых ухілаў на практыцы.

Пастанова ЦВК і СНК СССР

аб дапамозе асобам і гаспадаркам, якія пацярпелі ад кулацкага гвалту.

Вялічэзны рост савгасаў і калгасаў, выдаленьне кулакоў з саветаў, грамадзкае ўзьдзейнічаньне на кулака ў справе хлебазагатовак, захады да пашырэньня засеўных абшараў—выклікаюць актыўнае супраціўленьне кулацтва. У сваёй барацьбе супроць беднякоў і сераднякоў, якія пачынаюць перабудоўваць вёску на сацыялістычных асновах, кулацтва ня спыняецца перад забойствам сумленных савецкіх і грамадзкіх працаўнікоў, зьнішчэньнем іх маемасьці, нападам на калгасы і г. д.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў Саюзу ССР лічаць неабходным даць усямерную дапамогу з боку дзяржавы і грамадзкіх арганізацый пацярпеўшым барацьбітом за інтарэсы беднаты, за мерапрыёмствы савецкай улады ў галіне сацыялістычнае перабудовы вёскі. З гэтаю мэтаю Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў Саюзу ССР пастанаўляюць:

1. У выпадку калецтва ці сьмерці ад кулацкага гвалту самі пацярпеўшыя і сем'і загінуўшых забясьпечваюцца наступным чынам: а) калі пацярпеўшы быў застрахаваны ў парадку сацыяльнага страхаваньня, дык страхкаса выдае пэнсію ў разьмеры, як пры няшчасным выпадку; б) калі пацярпеўшы ня быў застрахаваны, дык пэнсія выдаецца ў парадку сацыяльнага страхаваньня ў такім самым разьмеры, як і пацярпеўшым у пыніку актыўнага ўдзелу ў барацьбе з контр-рэвалюцыяй.

2. У выпадку ўчыненьня кулакамі калецтва ці сьмерці асобам, якія выявілі выключную актыўнасьць у барацьбе з кулацтвам, самі пацярпеўшыя і сем'і загінуўшых атрымліваюць згодна закананадаўства саюзных рэспублік на асабовых пэнсіях.

3. Асобы, пакалечаныя кулацкім гвалтам, карыстаюцца мэдыцынскай дапамогай нараўне з застрахаванымі рабочымі. У разе патрэбы яны накіроўваюцца на курорты на наступных падставах: а) застрахаваныя—за кошт сродкаў сацыяльнага страхаваньня, б) незастрахаваныя—за кошт фонду санаторнага і курортнага лячэньня сялян, пераважна перад іншымі асобамі.

4. Дзеці забітых ці пакалечаных кулакамі асоб прымаюцца ў першую чаргу на дармовыя месцы ў дзіцячых дамы, калёніі і г. д., а таксама залічаюцца ў працоўныя школы, прафэсыянальна-тэхнічныя школы, тэхнікумы і іншыя адпаведныя навучальныя ўстановы і забясьпечваюцца стыпэндыямі і вучэбнымі прыладамі нараўне з дзецьмі рабочых. Ад платы за навучаньне яны вызваляюцца.

5. Пацярпеўшым ад кулацкага гвалту батраком і бедняком пазыка на ўступныя і паявыя ўзносы ў калгасы, а таксама гаспадарчыя прамысловыя каапэратывы выдаецца з фондаў каапэраваньня і калектывізацыі беднаты ў першую чаргу.

6. Гаспадаркі, якія належаць удовам і недарослым дзецям асоб, забітых кулакамі, на працягу 7-мі гадоў пасьля іх сьмерці вызваляюцца ад адзінага сельска-гаспадарчага падатку.

7. Калі кулакі папсавалі ці зьнішчылі маемасьць асобы, якая праводзіла актыўную барацьбу з кулацтвам, або калектыўнай гаспадаркі, дыкой гаспадарцы Дзяржстрах выплоўнасьцю страты па застрахаванай маемасьці. Дзяржстрах выплачвае ты па маемасьці, хаця-б яна загі па такой прычыне, ад якой яна застрахавана. Напрыклад, калгас загінуў ад агню, а панёс страх патраўленьня засеваў і г. д. якія выплачвае Дзяржстрах ка за загінуўшую ці папсаваную а джаную маемасьць, перадаюцца падзельныя капіталы калгасаў.

8. Аднаасобовыя і калектыўны спадаркі, пацярпеўшыя ад кул гвалту, атрымліваюць сельскадарчы крэдыт, а таксама выт дапамогу ў першую чаргу і на больш ільготных умовах.

9. Хадайніцтвы асаб, пацярп ад кулацкага гвалту, і іх сем'яў заныя з наданьнем им прадугле гэтаю пастановаю пераваг і п павінны разглядацца адпаведным ганамі ў тэрміновым парадку ўсякім разе не пазьней 2-х тыд часу падачы адпаведнага хадайн

10. Для выдачы адначасовай ратнай дапамогі асобам і гаспад пацярпеўшы ад кулацка гвалту, ас для выплаты за страты па незастр най маемасьці, павінны быць с ны не пазьней 1-га студзеня году ў парадку закананадаўства са рэспублік спэцыяльныя фонды мясцовых выканкомах. У гэтая павінна, між іншым, адлічацц менш за 25 проц. ад штрафаў, спаганяюцца з асобных гаспадар парушэньне пастаноў сходаў аб кананьні хлебазагатовак.

Канфэрэнцыя груп беднаты Менскай акругі

Шпаркі тэмп калектывізацыі вёскі—адзін з асноўных пункта наказу выбаршчыкаў сельсаветам і КСТУ.

З вялікім дакладам аб задачах рэканструкцыі сельскай гаспадаркі выступіў загадчык вясковага аддзелу Менскага акругкому КП(б)Б тав. **Тамашэўскі.**

Галоўнымі пытаньнямі рэканструкцыі сельскай гаспадаркі зьяўляецца: калектывізацыя, належная пастаноўка дзейнасьці зямельных органаў і, урэшце, і паленшаньне працы ў самых калгасах.

Наша сельская гаспадарка пакуль што адсталая, ёсьць аграрная перанаселенасьць, якую зьнішчыць пры сучаснай дробнасьці гаспадаркі нельга; нельга таксама гаварыць аб уздыме яе, аб ужываньні складаных с-г. машын, агратэхнічнай дапамозе, радыкальнай дапамозе беднаце, паленшаньні бытавых умоў сялянства—без асноўнага вырашэньня сельскай гаспадаркі на падставе яе калектывізацыі.

З другога боку, калектывізацыя сельскай гаспадаркі павялічыць таварнасьць яе.

Вось чаму камуністычная партыя так рашуча, так сьмела ставіць пытаньне правядзеньня ў жыцьцё ўзбудаваньня сельскай гаспадаркі на базе калектывізацыі.

Далей т. Тамашэўскі спыняецца на тым масавым руху калектывізацыі, які зараз у нас наглядаецца. Нават паяўляецца выпярэдніцтва паміж паасобнымі сельсаветамі: хто хутчэй поўнасьцю калектывізуецца. Так пераходзяць у калектывы м. м. Копыль і Грозава, у Сьмілавіцкім раёне аграмаджаны сэктар займае ўжо 24 проц., усёй абжытай зямлі, па Копыльскаму раёну—пад калгасамі ўжо занята 15 проц, У канцы 1930 г. ставіцца задача заняць пад калгасамі ў Менскай акр. 15,3 проц. абжатай зямлі, што павінна складаць 132.000 гэкт.

У сярэднім кожны калгас павінен займаць ня менш 250 гэкт. Зараз ужо рашуча ставіцца пытаньне аб пастаноўцы належнай працы ў калгасах і камунах. Калгасы павінны служыць прыкладам сялянству, што ў узбудаванай гаспадарцы лепш жывецца, чым у індывідуальнай. Гэта будзе зьяўляцца лепшай агітацыяй за калектывізацыю.

Побач з гэтым ня трэба забываць і аб тым, што кулацтва імкнецца дыскрэдытаваць ідэю калектывізацыі; яны распускаюць чуткі, што ў калектывістаў абагуленыя жонкі, што там здараюцца частыя бойкі паміж членамі калектыву і г. д.

Батрацка-бядняцка-серадняцкія масы павінны памятаць і ведаць, што клясавы вораг робіць гэта сумысьля, каб запужаць беднату, каб сарваць калектыўнае будаўніцтва.

Тав. Тамашэўскі закранае існуючыя недахопы ў калгасным будаўніцтве—гэта дробнасьць іх. Па-другое, слаба праводзіцца аграмаджваньне сродкаў вытворчасьці. Дрэнна таксама і тое, што ў некаторых калгасах надта слаба праводзіцца пая-зьбіраньне. Бываюць такія выпадкі, калі на кожную сям'ю выдаецца ў дзень па 12 літр. малака. Зусім слушна, што якая-б там ня была сям'я—12 літр. у адзін дзень не зьлясі, рэшта, што застаецца, зразумела, прадаецца і вельмі часта на прыватны рынак. З падобнымі іллжэ-калгасамі будзе весьціся самая жорсткая барацьба.

Зараз можна наглядаць,—кажа дакладчык,—і такія выпадкі, калі серадняк, ці заможнік, уступаючы ў збывае частку сваёй жывёлы, гэ біцца ў той час, калі ставіцца таньне аб павялічэньні жывёлы гасах. Мы ставім зараз пытан увязьненьні дыфэрэнцыраванага паасобна для батракоў, беднякоў раднякоў.

Трэба таксама зьвярнуць ува падрыхтоўку кадраў працаўнікоў калгасаў з членаў саміх-жа кал Дзеля гэтай мэты будуць арганіз курсы.

Закрануўшы пытаньне аб адн да справы абагуленьня нашай се гаспадаркі, т. Тамашэўскі кажа, да 1929 г. гэтай задачы адво ня досыць увагі. Наркамзем пра абрэзку савгасаў, арганізоўваў х У сучасны момант працу зяме органаў трэба так паставіць, ка іх дзейнасьць была накіравана і памогу калектывізацыі. На гэт базе павінна быць рэарганізаў праца сельсаветаў і КСТУ.

Ад нашай аграмаміі патраб каб яна перастала быць „земл яна павінна перабудаваць сваю ў бок набліжэньня яе да калгас

* * *

У спрэчках па дакладу выка т. т. Данілевіч, Амбросаў, Ру Корзун, Каранеўскі.

* * *

На ранішнім пасяджэньні 18 стапада канфэрэнцыя скончыла працу.

ПЕРАД СЭСІЯЙ ЦВК БССР.

Сэсія ЦВК БССР адчыняецца 20-га лістапада а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні клюбу імя Карла Маркса. У час Сэсіі мяркуецца правесьці нараду членаў і кандыдатаў у члены ЦВК БССР па пытаньнях:

а) аб асноўных палажэньнях пра арганізацыю сельскіх саветаў і б) аб перавыбарах саветаў. У час Сэсіі мяркуецца таксама правесьці экскурсіі на заводы, сельска-гаспадарчую выстаўку, у сталоўкі МЦРК і на стадыён фізкультуры.

20-га лістапада ў г. Віцебску пачнецца тыраж 1-й пазыкі індустрыялізацыі.

Згодна пастановы Прэзыдыуму ЦВК БССР, на ўрачыстае адчыненьне тыражу будзе дэлігіравана група членаў ЦВК БССР.

Аб скліканьні 2 усебеларускага зьезду рабочых і сялян латышоў.

**2-ГІ ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД РАБОЧЫХ І СЯЛЯН ЛАТЫШОЎ СКЛІКАЕЦЦА 24 ЛІСТАПАДА 1929

Бязьлітасная барацьба з правым ухілам.

Сельска-гаспадарчыя крэдытныя таварыствы Бабруйшчыны разьмяркоўваюць крэдыты паміж кулакамі і заможнікамі. Чыстка савецкага апарату ў Лагойскім раёне выкрыла праваднікоў кулацкай лініі ў земляўпарадкаваньні.

Вырваць з карэньнямі правую практыку.

(Ад нашага Бабруйскага карэспандэнта).

Цэлы шэраг крэдытных таварыстваў на Бабруйшчыне яе вытрымалі палітычнага экзамену, не апраўдалі тых задач, якія стаяць перад імі, як крэдытнымі арганізацыямі. Цэлы шэраг крэдытных таварыстваў у сваёй рабоце не бралі асноўную ўстаноўку на абслугоўваньне бедняка і серадняка, а дапамагалі кулаку ўзмацняцца, крапчэй укараняцца ў вёсцы. Аб гэтым сьведчаць тыя факты, што на цэламу шэрагу крэдытных таварыстваў (Чыжэвіцкае, Чырвона-Слабодзкае, Ціхініцкае, Чырвона-Бярэскае, Мормальскае і інш.) сума сярэдняе пазыкі вымяраецца ў залежнасьці ад моцнасьці гаспадаркі. Калі, напрыклад, на Чыжэвіцкаму таварыству для бедняка сярэдняя сума пазыкі роўна 44 руб., дык для заможніка яна роўна 64 руб. Такое становішча наглядаецца і ў Чырвона-Слабодзкім таварыстве; тут сярэдняя пазыка для бедняка роўна 42 руб., а для заможніка—57 руб.

У справе крэдытаваньня наглядаецца самае злоснае скрыўленьне клясавай лініі крэдытнымі таварыствамі. Хіба дапусцімы такія зьявы, што Чыжэвіцкае таварыства заможніку, які мае 3 коняй, выдае крэдыт на куплю чацьвертага каня? Чырвона-Слабодзкае таварыства цэламу шэрагу асоб, якія маюць на 10-15 дзесяцін зямлі, на 3 коняй і на 3-4 кароў—выдае крэдыты ў той час, як у раёне таварыства ёсьць многа беднаты, якая не задаволена крэдытам.

Асавецкае таварыства ў справе крэдытаваньня заможнікаў і прыватнікаў пабіла, як кажуць, рэкорд. Яно выдавала крэдыт млынару Альтшулеру на рамонт млыну, гандляру Ярмалінскаму, мусіць, на разгортваньне гандлю і г. д. Тут дайшлі да таго, што для кулакоў і іх падобных завялі нявыя парадкі крэдытаваньня. Багацейшыя крэдытаваліся на болей ільготных умовах, чым беднота.

Ня менш характэрныя факты ёсьць і ў галіне каапэраваньня беднаты за кошт спэцыяльна вылучанага на гэта фонду. У Чырвона-Бярэскім таварыстве аказаўся каапэраваным за кошт гэтага фонду кулак індывідуальнік Жолтак. У Чырвона-Слабодзкім таварыстве каапэравалі такіх, якія маюць на пары коняй, тры каровы і па дзесяць гэкт. зямлі.

Проста значнымпм трэба прызнаць становішча са скарыстаньнем фондаў крэдытаваньня беднаты па гэтым таварыствам. Ні ў водным з вышэй пералічаных таварыстваў поўнасьцю гэтыя фонды не скарыстаны. На Мормальскаму таварыству гэты фонд скарыстан долькі на 9 проц., па Бацэвіцкаму на 30 проц.

Прыходзіцца яшчэ адзначыць тое, што і ў пратэрміноўках кулакі карыстаюцца ў некаторых таварыствах большымі ільготамі, чым беднота і серадняцтва. За кулакамі і заможнай часткаю вёскі налічваецца значна большая доля пратэрміновак, і таварыствы на гэта не зварачваюць ніякай увагі.

Такая работа ні ў якой меры не адпавядае лініі нашай партыі і ўраду. Прыклады паказваюць, што нашы крэдытныя таварыствы праводзілі ў сябе правую практыку. Гэтая практыка ўжо ўвашла ў сыстэму работы таварыстваў.

Пры такой пастаноўцы работы ў нашай крэдытнай сыстэме цікавым зьяўляецца факт, чаму да гэтага часу нашы вышэйшыя крэдытныя органы і ўстановы, якім падпачальваюцца нашы крэдытныя таварыствы, ня ўдарылі палец аб палец для таго, каб своечасова праверыць работу таварыстваў і ня іраваць іх на правільны шлях.

Такое прымірэнцтва да правага ўхілу ў рабоце нашых крэдытных таварыстваў, як і само правядзеньне правай практыкі, павінна быць з карэньнямі вырвана.

А. Дамброўскі.

На паваду ў клясавага ворага.

33 ПРОЦ. ПРАДУКЦЫІ СТАЙКАЎСКАГА ЛЕСАПІЛЬНАГА АВОДУ ПРАДАНА ПРЫВАТНІКУ. ПАЛОВА СУКНА ЯКАЎЛЕВІЦКАЙ ФАБРЫКІ ТРАПІЛА ПРЫВАТНЫМ ГАНДЛЯРАМ НА ІЛЬГОТНЫХ УМОВАХ. АБСТАЛЯВАНЬНЕ ГАЗА-ФРУКТОВАГА ЗАВОДУ ЗНОЎ У РУКАХ БЫЛОГА ЎЛАСЬНІКА. МЭХАНІЧНЫЯ ЧАСТКІ АЎТА-ГАРАЖУ РАСКРАДЗЕНЫ. БЫЛЫМ ЗАГАДЧЫКАМ Н ДЗЯРЖ. МЫЛЫНУ ПАБУДАВАНЫ ДАМЫ Ў ДНЯПРОПЭТРОЎСКУ.

На станцыі Стайкі пачынаецца работа: грузяць дошкі і другія ласаматарыялы, грузяць не дзяржаўным установам, а прыватніку.

Прыватнікі, лесапрамыслоўцы—Лутоцкі І. П. атрымлівае ад лесапільнага заводу 21 вагон дашок на суму 11000 руб., Хэйфец—два вагоны на 1625 руб. Акцыянэрнае т-ва „Страт"—10 вагонаў на 8272 руб. Штэльберг—8 вагонаў на 6642 р., Стружскі прыватны лесапільны завод—11 вагонаў лесматар'ялу на 3698 руб.

У нас да сёпешняга дню была ўпэўненасьць у тым, што дошкі пры расьпілоўцы тут-жа сартуюцца, гатунак дошак вызначаецца адразу пасьля іх вырабу, але на справе ня так. Бухгальтар Камтрэсту Старасельскі, дырэктар трэсту Сьліўкін і былы буйны лесапрамыслоўца Аршанцчыны Файтэльсон завялі новую сыстэму бракаваньня. Пачалі бракаваць дошкі пры фактычнай адпраўцы. Гэта дало магчымасьць Элькінду, Старасельскаму і Файтэльсону „зарабіць капейку". Дошкі першага і другога гатунку прадаваліся прыватніку, як трэцяга і чацьвертага гатунку.

Невядома колькі ў сваю кішэню паклалі дзяржаўных сродкаў Элькінд, Старасельскі, Файтэльсон і К-о, але можна сказаць, што гэта пахне тысячамі рублёў. Для таго, каб захаваць ад кантраліруючых органаў і ад грамадзкасьці свае шкодныя, злачынныя дзейньні, знаёмыя нам працаўнікі робяць так, што бухгальтэрыя адстае роўна на год.

Якаўлевіцкая фабрыка выробляе сукно. Сукно павінна было ісьці для разьмеркаваньня сярод пайшчыкаў праз каапэрацыйныя аб'яднаньні. Але калі накіраваць сукно толькі ў каапэрацыю, то нічога не атрымае прыватнік. Талочынскі агэнт па продажу і знаёмыя для нас Файтэльсон, Старасельскі знаходзяць выхад. У Камтрэсьце ўзоры сукна падзяляюцца на дзьве катэгорыі: для каапэрацыі і для гандляроў. Каапэратывам прапаноўваюцца зусім нявартыя ўзоры, ад якіх каапэрацыйныя арганізацыі вымушаны адмаўляцца з-за дрэннай якасьці сукна, у той-жа час добраякаснае сукно па другім узорам (якія адпавядаюць сапраўднасьці) прадаецца прыватнікам-гандлярам.

Купляючы сукно, прыватнікі ішлі па той-жа сьцежцы, як і лесапрамыслоўцы. Талочынскі агэнт па продажы ад кожнага праданага мэтру сукна заробіў ад 25 кап. да 1 руб. у залежнасьці ад якасьці сукна.

Застановімся яшчэ на некалькіх красамоўных прыкладах. Ад нацыяналізаванага газа-фруктовага заводу (Ворша) Камтрэсту засталося добраякаснае абсталяваньне. Нам невядома, чым было выклікана імкненьне ў дырэктара Трэсту Сьліўкіна збыць дорага каштоўнае абсталяваньне. Факт той, што зусім нядаўна абсталяваньне (у сваёй большасьці з чырвонай медзі) прадана прыватніку Штэйнгарту за 563 руб., у той час, калі толькі 38 медных балонаў каштуюць каля 2000 рублёў, някажучы ўжо аб газавікох машынах і інш. абсталяваньні.

Камтрэст для рамонту аўтамашын купіў замежныя мэханічныя часткі на 6000 руб.

Загадчыкам аўта-гаражу Стальновым рамонт зроблен ня быў, а мэханічныя часткі расьцярушаны і праданы, грошы пайшлі ў кішэню. Факт той, што некаторыя шофэры, як Сьмітэнка, набыў уласную легкавую аўта-машыну. Ня цяжка здагадацца за якія грошы. Для таго, каб захаваць злачынствы каштоў насьць машын, якія перададзены Горкамбінату, навялічана на суму расьцягнутых мэхавічных частак, г. зн. на 6000 р. Машыны сыстэмы „Форд" Трэстам былі набыты ў аўта-прамгандлі па 750 руб. кожная, а перададзены Горкамбінату пасьля эксплёатацыі на працягу году коштам па 1200 руб. Трэба дадаць, што Камтрэст меў страту ад эксплёатацыі машын звыш 4000 руб.

Саліваковіч, Баярам, Грабенчыкам для ўласных патрэб была набыта машына коштам у 4000 руб. Машыну разьбілі ў час аднаго падарожжа (п'яныя паехалі на курэрскі цягнік), якую ўрэшце прадалі за 1200 руб.

Ня можна прайсьці міма дзейнасьці былога сакратара парт'ячэйкі Гарбатова. Гарбатаў працаваў у якасьці загадчыка другога дзяржаўнага млыну, якому Камтрэстам была дадзена агульная скідка „на ўтруску" у ліку 2-х процантаў ад намолу. Гэтых двух процантаў хапіла для набыцьця Гарбатавым некалькіх дамоў у Дняпропэтроўску і яшчэ застаўся адзін вагон мукі ліпшаў, які быў знойдзены пасьля ўхода Гарбатава.

У Мсьціслаўлі маецца бровар, які ўваходзіў у Камтрэст. На бровару крахмальнасьць бульбы не вызначалася, што давала маглівасьць Сьвішчэўскаму і вінакуру Кацу ня толькі прадаваць бульбу на бок, але не дасынаць глянцы на 2-3 мэтры. Адсутнасьць вызначэньня крухмалістасьці бульбы дазваляла прывазіць у Воршу гарэлку для „выпівак" са Сьліўкіным, Боярам і інш. людзьмі з акруговага цэнтру. У выніку ўсёй гэтай злачынасьці, кіраўнікі пралічыліся—не хапіла чатыры вагоны бульбы на суму 1500 руб., якая была сьпісана Сьліўкіным па акту на правес.

Мы далі пералік толькі найбольш галоўных злачынстваў Аршанскага Камтрэсту. Нас цікавіць тое, што да гэтага часу значная частка гэрояў нашага допісу займаюць адказныя пасады і працягваюць шкодную дзейнасьць. Лічым, што з гэтага матар'ялу належныя вывады зробіць рабоча-сялянская інспэкцыя.

З. Станкоўскі.

Ворша.

Прышчэпаўскія хутары.

(Лагойскі раён, Меншчына).

Земляўпарадкаваньне праводзіў згодна дырэктывы вышэйшага начальства,—так адказаў каморнік Юхневіч на пытаньне камісіі на чыстцы савецкага апарату адносна ўтварэньня хутароў у Лагойскім раёне.

І каб даказаць свае словы, спаслаўся на сакрэтны ліст, адрасаваны яму 20-III 1927 г. наступнага зьместу:

„Па маючымся зьвесткам, у некаторых раёнах Менскай акругі былі выпадкі прымусовага навязваньня формаў землякарыстаньня. З гэтай прычыны АКР земаддзел прапануе вам устрымацца ад прымусовага навязваньня сялянам форм землякарыстаньня і забароны сяліцца хутарамі і атрубамі, не зьмяняючы пры гэтым агульнай палітыкі па гэтаму пытаньню (установка на калгас, дробны пасёлак). Адначасова катэгарычна забараняецца арганізацыя буйных пасёлкаў, якія ў нашых умовах ні якага эфэкту не даюць, а праводзіць пабудову дробных пасёлкаў. Падпісалі: „Загадчык Акрза Філатаў, Сэкратар Шаціла".

„Не зьмяняючы пры гэтым агульнай палітыкі"... піша „начальства" каморніку спэцу. Цікава ведаць з якіх гэта часоў наша „агульная палітыка" трапіла ў залежнасьць ад спэцыялістых? ці гэта можа толькі ў зямельных справах? (як найменш важных ці што!?)

Каморнік узяў установу на „дробны пасёлак", а з прычыны таго, што паміж дробнымі пасёлкам і хутарам фактычна амаль няма розьніцы, то пры зямляўпарадкаваньні проста арганізоўваліся хутары. І ў той час, як праводзілася зямляўпарадкаваньне, пытаньне аб арганізацыі калгасаў нават ня ставілася на абгаварэньні с.

Вельмі цяжка ў нашых умовах будаваць калгасы,—кажа каморнік,—глеба для гэтага не падрыхтавана.

Зразумела, чым рыхтаваць глебу для калгасаў, ляпей пайсьці па лініі найменшага супраціўленьня і ўзяцца за стварэньне хутароў. З такой думкай прыступаў да працы каморнік і, трэба прызнаць, што меў значныя посьпехі. Дапамог яму ў гэтым ўпаўнаважаны па земляўпарадкаваньню (в. Гасьцілавічы) Бобкарскі Янка, кулак, пазбаўлены выбарчых правоў.

Па думцы каморніка, ён вытрымаў чоткую клясавую лінію, бо на Сталыпінскіх хутарох сядзелі заможнікі, а на „Прышчэпаўскіх"—садзім выключна беднату. Сапраўды, створаныя па аднэй толькі вёсцы Гасьцілевічы 17 хутароў—выключна з беднаты...

Бедняка Кіселя Янку выселілі на хутар па пастанове кулакоў, якім ён надта дакучаў у вёсцы. Таксама сілком выселен на хутар па пастанове агульнага сходу пад пакравіцельствам каморніка Юхневіча бядняк пастух Пабкоўскі Арцёр, які павінен быў атрымаць зямлю ад абрэзкі кулацкай гаспадаркі.

Пры абрэзцы кулацкіх гаспадарак абразалася самая горшая зямля, а кулакам накідалі максымальную норму лепшых угодзьдзяў, чым фактычна зьмяншаўся падатак і павялічваўся прыбытак ад гаспадаркі. Большасьць кулацкіх гаспадарак зусім аслабляліся ад абрэзкі пад відам „культурных гаспадарак". Падобна такім „культурнікам" пакінута 24 дзесяціны Дзягілевіну кулаку х. Тумараўшчыны, які мае 12 кароў, [illegible] 20 галоў дробнай жывёлы і плаціць падатку 2.000 руб. Таксама на хутары Саўдзеевічы кулаку Гаенку, пазбаўленаму выбарчых правоў, пасьля абрэзкі пакінута 16 дзесяцін зямлі, апрача таго ён мае млын. На хутары Модухава кулаку Партановічу пасьля абрэзкі пакінулі 48 дзес. Гэты праэкт зацьверджан акруговай зямельнай камісіяй.

Ня гледзячы на тое, што ў Лагойскім раёне ёсьць шмат беззямельных, зямлёю надзяляюцца папы, ксяндзы, гандляры. Няма ніводнага папа, які не атрымаў-бы зямлі. У в. Янушковічах пры земляўпарадкаваньні папу Акуловічу дадзены 3 дзесяціны зямлі. У в. Юркавічах ксёндз атрымаў 2 дзесяціны зямлі. У в. Гацкі поп карыстаецца 6-ю дзесяцінамі зямлі. Нават у цэнтры раёну Лагойску на вачох раённых арганізацый поп Вержбаловіч мае 6 дзесяцін зямлі. У 1927 г. пры земляўпарадкаваньні х. Цагельні каптрабан дысты Горшман атрымаў 6 дзесяцін зямлі. Буйны гандляр, маючы смалакураны завод, таксама карыстаецца вучасткам зямлі.

Беднота вельмі моцна адчувала на сваім карку права-апартуністычную лінію ў рабоце зам. апарату. Батрак Равяка атрымаў 7 дзесяцін зямлі ад абрэзкі кулака Радкевіча, і пачаў ужо ставіць будынкі. Зьяўляецца каморнік, складае акт аб тым, што гаспадарка Радковіча як „культурная", абрэзцы не падлягае. На гэтай падставе Радкевіч, пры садзейнічаньні акруговай зямельнай камісіі, дабіваецца адмены абрэзкі з адачай пад суд райземкамісіі за „абрэзку культурнай гіспадаркі", і батраку Равякі прышлося пераносіць свае будынкі, патрашчыны на гэта апошнія сродкі. Кулак Родкевіч пасьля такой апэрацыі сьмяецца над беднатою: „Так вам і трэба, будзеце ведаць, як сяліцца на нашай зямлі". Батракам Чысёнку і Белко дадзена па 4 дзесяціны зямлі з абрэзкі гаспадаркі кулака Пратасоўскага, справа дайшла да ЛВЗК, якая адмяніла пастанову райземкамісіі і пакінула батракоў бяз зямлі. Лагойская зямельная камісія зацьвердзіла праэкт каморніка аб абрэзцы кулака Лайсоўскага, якому пакінута самай лепшай зямлі 13 дзесяцін, у той час як бедняку Фалею дасталося толькі 1,90 дзес. дрэннай зямлі. Безьзямельны, былы саматужнік, Раскінд зьвярнуўся ў РВК за атрыманьнем зямлі пры абрэзцы кулацкай гаспадаркі х. Цагельня, але яму ў гэтым адмовілі, у той час як зямлёй, у колькасьці 6-ці дзесяцін, надзелены гандляр, пазбаўлены выбарчых правоў.

Некаторыя кулацкія гаспадаркі захаваліся ад абрэзак, як „культурныя", затое савгасы абразаліся ў першую чаргу. Савгасу Лупаўшчына, які меў 403 дзесяціны, пакінута 283 дзесяціны. У савгасе Косіна абрэзана 54 дзесяціны. У савгасе Лагаза абрэзана 52 дзесяціны. У савгасе Слабодка абрэзана 120 дзесяцін. Нават камуна „Чырвоны Кастрычнік" таксама значна абрэзана ў карысьць індывідуальных гаспадарак.

У Лагойскім раёне да 1929 году было ўсяго толькі 4 дробных калгасы па 3-4 сям'і; уся ўвага была зьвернута на дробныя пасёлкі. Толькі ў 1929 г. вясною арганізавана 10 калгасаў.

Паказальныя вучасткі адводзяцца кожны год, але ніякіх рэальных вынікаў яны не даюць. Наогул, як каморнікі, так і аграномы, а іх у раёне налічваецца каля дзесятка, выхаваўчай работы не вядуць. Установлена сувязь некаторых каморнікаў з чуждым элементам—папамі, кулакамі.

„Прышчэпаўшчына" ў Лагойскім раёне адчувала сябе досыць моцна. Цэлы шэраг скрыўленьняў клясавай лініі, мяшаных з крымінальным злачынствам, ускрыла зараз камісія па чыстцы Савецкага апарату. Матар'ял перададзены ў акругавую пракуратуру для прыцягненьня вінаватых да крымінальнай адказнасьці. Асноўная маса сялянства вельмі нэрвова рэагуе на правую практыку ў зямельным пытаньні і кажа: „нашы зямельныя працаўнікі ня ўмеюць праводзіць клясавую лінію, так трэба навучыць іх, каб другім не павадна была".

В. Бальзоўскі.

Сярыўляюць крэдытную палітыку партыі

(М. Ляды, Аршанскай акр.).

Ляднянскае с.-г. крэд. т-ва, старшынёй якога зьяўляецца А. Земчык, у сваёй рабоце праводзіць правы ўхіл у жыцьцё. У вясеньнюю пасеўную кампанію, пры правядзеньні кантрактацыі ільна-валакна, Земчык беднякам адмаўляў у крэдыце. Ён казаў бядняцкі Кошкінай Праскоў'і з в. Белі: „Я вам на кантрактацыю ня дам, бо ў вас маемасьці няма і нам ільга будзе потым спагнаць пазыку".

Пад яго абаронай знаходзяцца былыя гандляры, пазбаўленыя выбарчых правоў, якія вычышчаны з устаноў камісіяй па чыстцы апарату, але ня гледзячы на гэта яны работаюць і на гэты час.

Земчык раздае крэдыты не выраша-ючы гэта пытаньне на праўленьні, а сваім асабістым росчаркам алоўка. Земчык цягне валакіту ў разборы заяў на выдачу крэдытаў і насеньня. Як гэта было з бедняком лўрэм-земляробам гр. Бас Абрамам, якому ён больш паўгода абіцаў выдачу крэдыту на пераноску хаты. Не даваў да таго часу, пакуль не ўмяшалася арганізацыя АЗЭТ.

Трэба зрабіць праверку работы Ляднянскага с.-г. крэд. т-ва і вінаватых прыцягнуць да адказнасьці.

Селянін.

Праверка і чыстка шэрагаў партыі.

Праверка пабальшавіцку.

(Ячэйка ЦВК, СНК і Дзяржпляну БССР).

ужо 22 дзень ідзе праверка і ячэйкі ЦВК, СНК і Дзяржпляну. За гэтыя 22 дні праверена 20 таёў.

У тым ліку быў праверяны і член ячэйкі ЦСУ тав. Прафэрансаў. Яго Прафэрансава заняла цэлы вечер. Яму было зададзена цэлы шэраг розных пытаньняў, на якія ён адказваў так, калі Шут Балакіраў адказваў Пятру. Яму. Ён спрабаваў прыводзіць нейкі цытаты з Гэрцэна, а потым з Леніна, гэтыя цытаты зусім недатычыліся Прафэрансава, як да асобы. Злажылася вое ўражаньне, што ён, навакол паных яму ва ўпор пытаньняў хапізка, але-ж прамога бальшавіцкага не даваў.

Сярэдні па кандыдатуры т. Прафэрансаказалі і ахарактарызавалі яго як га працаўніка. У сваёй штодзённай ён, як кіраўнік ЦСУ, не зьвяртаў ае ўвагі на правільнае правядзеньпараце ЦСУ нацыянальнае праленае палітыкі, дзякуючы чаму яго наек, член партыі, т. Пайкін, на адным джэньняў калегіі ЦСУ дайшоў да што абурыўся на аднаго працаўніка-ца, за тое, што апошні выказваўся арускай мове. Пайкін гэтаму тавазаявіў так: „Говори на общепонятные. По русски". Тав. Прафэрантаму зарваўшамуся, вялікадзяржаўнавініству, нават не зрабіў заўвагі. з беларусізацыяй апарату ЦСУ е і пагаслбленьне русіфікатарзе далей. Тав. Прафэрансаў нават олы паседжаньняў калегіі ЦСУ ў з беларускае мовы на расейТаумачыў т. Прафэрансаў гэта што яго намесьнік т. Пайкін не ее беларускае мовы.

ступаўшыя ў спрэчках таварышы стукнулі Прафэрансава на яго інцкай мяккацеласпі.

Пр 15 лістапада быў прысьвечаны чна праверны сакратара нашае ячэйкі тав. Корфа. Тав Корф па у сацыяльнаму паходжаньню рарукар. Стары бальшавік, падпольякі добра знаём з ссылкамі і царказматамі. Ён як бальшавік са ўсёй авіцкаю шчырасьцю расказаў схораверачнай камісіі свой пройдзены рэвалюцыянэра, ня ўтойваючы і адмоўных бакоў.

кандыдатуры т. Корфа ў спрэчках лася больш 18 таварышоў, якія альшавіцкі паказалі яму на адня і становучыя бакі яго працы.

ні таксама выступленьні, зьвязаныя здзеньнем у часе чысткі партыі ых рахункаў, выступленьні і накія супроць тав. Корфа з мэтаю мэтаваньня яго як бальшавіка. з выступаўшых нават дагаварыўся о, што калі т. Корф мае заслугі пеэвалюцыяй—дык яго трэба перана пэнсію, што ён на сёньняшні як бальшавік, страціў сваё знае. Такая прапанова сустрэла абуе ўсяго сходу. Гэтыя таварышы алі жорсткі адпор з боку рабочых, рысутнічалі на гэтым сходзе, а так ўсёй ячэйкі.

ра (16 лістапада) праходзіў чыстку партыі т. Красьцін. Тав. Красьцін е ў апараце ЦВК ў якасьці камэн. Праверка яго дала шмат зусім новых ялаў для праверкому, адносна тых ў партыі, якія ўжо прайшлі пра і аб якіх нават ніхто і не заікалі, калі праяўралася тая, ці іншая Тав. Красьцін так сказаў, што ва сярод чаасобных працаўнікоў з ту ЦВК было нармальным зьявішчам. Ініцыятарамі гэтых п'янак былі заўсёды такія таварышы, як: загадчык (быўшы, зараз ён працуе ў БДВ) сэкратарыяту ЦВК т. Рай, інструктар ЦВК т. Елін (зараз працуе ў якасьці старшыні Аршанскай акрземкамісіі), сакратар камісіі прыватных амністый пры ЦВК т. Вялічка (які зараз сядзіць у папраўчым доме) і завяршаў гэтую п'янную кампанію сам быўшы сакратар ЦВК т. Чарнушэвіч.

Напіваліся, кажа т. Красьцін, так, што быў такі выпадак, калі т. т. Елін і Рай ухапіліся за сякеры і ўчынілі дэбош і гэты дэбош абыйшоўся без ахвяр толькі дзякуючы таму, што іх разьняў т. Красьцін. Мала гэтага, на машынах раскатваліся з прастытуткамі і да прастытутак. Калі т. Красьціну задаюць пытаньне—„што ты рабіў, як член партыі, каб і рэагаваць на гэтыя зьявішчы,—ён адказвае:

— „Я сам удзельнічаў у гэтых папойках, праўда, я піў „на пушку"—„на пушку"—гэта значыць дарэмна, за кошт астатняй кампаніі,—„нэсрэагаваў дзякуючы таму, што тут былі ўсё „вялікія людзі".

Выступаўшыя таварышы адзначылі, што т. Красьцін, як член партыі пайшоў на лініі разлажэньня. На тыя хваравітыя зьявішчы, якія былі ў ячэйцы да 1927 г., ён як бальшавік не рэагаваў. Ён сам быў зьвязаны гэтаю кампаніяю па руках і нагах, таму ён і маўчаў.

Праверка і чыстка нашае ячэйкі дапамагла разсячы гэтыя моцна завязаныя вузлы кругавой парукі. Загаварылі ўсе, бо той вузел, які быў завязаны, лопнуў і клубочак на крыху разматваецца. Трэба спадзявацца, што правярком зробіць з гэтага належныя вынікі і ўбярэ з ячэйкі канцы гэтага агіднага клубка, які заматваўся на працягу цэлага шэрагу гадоў.

З свайго боку я прапанаваў-бы тым праверачным камісіям, якія яшчэ будуць правяраць т. Рая і той праверачнай камісіі, якая ўжо праверыла т. Чарнушэвіча зьвярнуць асаблівую і сур'ёзную ўвагу на памянёных таварышоў.

Пару слоў аб крытыцы і самакрытыцы. Тут пытаньне бясспрэчнае, што гэтая праверка дала значны крок уперад да яе разгортваньня. Са ўсёй яскравасьцю высьветлілася, што ў нашай ячэйцы крытыка і самакрытыка ў дастатковай меры ня была разгорнута. Гэта вядома, у значнай ступені, залежала ад таго закручанага клубка, які ўдалося раскруціць толькі цяпер.

Дзякуючы гэтай праверкі, новыя хвалі крытыкі і самакрытыкі, бальшавіцкай крытыкі, пракаціліся праз усю ячэйку. Ячэйка ўскалыхнулася. У сваёй далейшай працы ячэйцы трэба ўлічыць усе моманты добрых і адмоўных бакоў працы і прыняцца ўсім калектывам за працу ўжо па новаму.

Фрунзэўскаму райкому КП(б)Б з свайго боку патрэбна будзе падумаць наконт расчляненьня адной ячэйкі—на тры. Стварыць асобныя ячэйкі ў ЦВК, СНК і Дзяржпляне. Неабходнасьць гэтага са ўсёй яскравасьцю паказала праверка і чыстка. Адна ячэйка з абслугоўваньнем памянёных трох устаноў не змагла справіцца і не таму, што яна не жадала гэтага, а таму, што гэта зусім розныя ўстановы па выконваемых імі работах: працаўнікі камуністы дзяржпляну ня ведалі што робіцца ў апараце ЦВК і наадварот. Стварэньне-ж ячэек пры кожнай установе карысна яшчэ і тым, што мы гэтым самым прыцягнем і беспартыйны актыў да актыўнае працы ў абгаварэньні тых ці іншых пытаньняў з жыцьця той установы, у якой яны працуюць.

Сергей Лодыгеў.

Аздаравілі ячэйку.

лістапада камісія скончыла пра чыстцы прыгараднай парт'ячэйкамісіяй вылучана шэраг адмоўбакоў, як у працы самой ячэйкі, за асобнымі камуністамі.

абую ролю адыгрывала ячэйка ў ніцтве ўстановамі і арганізацыяват сам сэкратар ячэйкі т. Казбудучы сябрам праўленьня „Земба", не заўважыў павышэньня на некаторыя тавары, растрату працаўнікамі каапэрацыі ў суме рублёў і ня прыняў захадаў да чэньня гэтых недахопаў

справе перабудовы вёскі ячэйка алася агітацыяй, а практычна мазрабіла. Маецца недапушчальны дак, калі ячэйка рэкамэндавала шнёй калектыву быўшага арандаЖукевіча, за што камісія вы бюро ячэйкі вымову.

рацы сярод беднаты і батрацтва ь што ня было і нічога ня зроб ў галіне ўцягваньня батрацтва і аты ў партыю. Працы сярод жанчын, асабліва сярод калегатак, ніякай не праводзілася.

Недастатковае кіраўніцтва было і ячэйкай ЛКСМБ, якая налічвае ў сваіх шерагах 9 асоб. Росту комсамольскай ячэйкі за лік батрацтва ня было. Сэкратар ячэйкі—кандыдат партыі—быў адарваны ад штодзённага кіраўніцтва ячэйкай.

З пытаньнем па хлебазагатоўцы ячэйка спраўляецца, але з боку асобных камуністаў у гэтай галіне былі клясавыя скрыўленьні.

З беларусізацыяй справа абстаіць дрэнна. Шэраг партыйцаў і працаўнікі ва ўстановах ня ўжываюць у штодзённай працы беларускай мовы

Трое камуністаў за невыкананьне лініі партыі і парушэньне яе выключаны з шэрагаў партыі, а шмат членаў ячэйкі за адрыў ад беднаты і зажым самакрытыкі атрымалі партыйнае ўзысканьне.

Селькор.

(Менск).

Рэканструкцыю нашай смалярна-шпігінарнай прамысловасьці.

беларуская смалярна - шпігінарная мысловасьць за апошнія гады разваецца надзвычайна шпаркім тэм. За два гады амаль што ўтройчы лічыўся лік смалярных катлоў 1927 г. смалярных катлоў было , а ў 1929 г.—380), а таксама і ьны размах прадукцыі.

а мінулы год прадукцыя нашых ляpняў на экспарт складала 6000 шпігінару і 13000 тон смалы, на у каля трох мільёнаў рублёў.

экспарце шпігінару і смалы БССР, іж рэспублік Савецкага Саюзу, выіць на першае месца, стаўшы такім нам значна прыкметнай і на сусьветы рынку. Мы значна ступілі наперад, адзіўшы ў сябе ачыстку чырвонага ігінару на белы, што дало навялыне цаны тоны шпігінару з 270 р. 488 р., як поўкаштоўнага фабрыку. У тэмпе разгортваньня гэтае галы прамысловасьці БССР паказвала ою добры прыклад абуджэньня і ту вытворчых сіл Саюзу ССР.

Аднак, рост гэтае прамысловасьці чэ далёка не разьвязвае асноўных аблем, якія паўсталі цяпер перад лярна-шпігінарнаю і тарпатынаваю творчасьцю ў БССР.

Праўда, наш спосаб смалярства, які рактарызуецца сухою перагонкаю ёвых карчоў пры дапамозе беларскага („польскага") катла аб'ёмам 20 кубічных мэтраў, зьяўляецца ілепшым з вядомых у СССР самажных спосабаў смалярства. Ён фактычна ўжо не саматужны, а хучэй поўфабрычны і гэтым наша смарна-шпігінарная прамысловасьць стаўча адрозьнівацца ад аналёгічнай рамысловасьці іншых частак Савецкага Саюзу.

Праўда, мы можам сябе суцяшаць тым, што на першыя часы разгортваньня прамыс овасьці лепш здабываць хаця поўфабрыкаты—чырвоны шпігінар і смалу, чымся нічога не здабываць, з такое сыравіны, як карчы, якія без гэтага ўсё адно згніваілі-б у зямлі без услякае карысьці.

Для поўнага этапу нашае прамысловасьці такія меркаваньні маглі быць зусім розоннымі; такі стан смалярна-шпігінарнае прамысловасьці дагэтуль адпавядаў нашай эканоміцы і нашым магчымасьцям. У сучасны-ж момант, калі наша прамысловасьць, стаўшы на рэйкі рэканструкцыі, выявіла надзвычайна вялікі попыт на белы шпігінар і асабліва на каніфолю (папяровая, мылаварная, гумовая, лякафарберная і іншыя галіны прамысловасьці), беларуская смалярна-шпігінарная прамысловасьці павінна таксама падвысіць сваю прадукцыю і палепшыць якасьць вырабу, каб у выніку гэтага выпрацоўваць ужо гатовыя, замест чырвонага шпігінару—патрэбныя для прамысловасьць фабрыкаты, як-та: белы шпігінар і каніфолю сярэдняе маркі, якую мы дагэтуль увозім з Амэрыкі ці з Францыі, плацячы па 468 рублёў за тону.

Нядаўна ў беларускай лясной гаспадарцы і лесахэмічнай прамысловасьці заснавана тарпатынавая вытворчасьць (зьбіраньне смалы тарпатыны з наўмысна-параненых хвоек на лесасеках, вызначаных пад высечку і ў перапрацоўцы гэтае тарпатыны на белы «французскі» шпігінар і каніфолю высокае маркі). Калі мець на ўвазе тое, што ў сёлетні вэгетацыйны пэрыяд наглядаліся на дасьледчым Вяляцкім вучастку такія выхады тарпатыны, як 2 і нават 4 кілёграмы з аднаго дрэва пры 4-6 карах-уздымках, то зусім яснаю робіцца пэрспэктыва тарпатынавае вытворчасьці ў БССР пры гадавой хваёвай лесасецы ў 10.000 гэктараў

Сучасны рэкаструкцыйны пэрыяд ва ўсёй нашай прамысловасьці нахіліць нашу сучасную смалярна-шпігінарную прамысловасьць, якая перастроіўшыся на экстракцыйную каніфольна-шпігінарную прамысловасьць, у далейшым будзе вельмі блізкім спадарожнікам тарпатынавай прамысловасьці, бо ў выніку „падсочкі" хваёвыя пні і карчы зробяцца яшчэ больш багатымі на смалу і шпігінар, г. зн. больш каштоўнай сыравінай.

Ажыцьцяўленьне такое пэрспэктывы ў нашай лесахэмічнай прамысловасьці значна ўздыме эканоміку рэспублікі, даўшы патрэбную колькасьць каніфолі і шпігінару для рэспубліканскае і саюзнае прамысловасьці, а таксама высокасортныя экспартныя прадукты на замежны рынак.

Патрэба ў найбольш рацыянальным выкарыстаньні такое сыравіны, як хваёвыя карчы, з якіх мы пакуль што здабываем толькі поўфабрыкаты ня высокай якасьці, бязумоўна, вымагае больш востра ставіць пытаньне рэарганізацыі смалярна - шпігінарнае вытворчасьці на экстракцыйную каніфольна-шпігінарную.

„Дасьпелы" хваёвы корч, які звычайна мае ў сабе 12-40 проц. смалы (каніфолі) і 2-7 проц. шпігінару, у выніку сухой перагонкі, пры дапамозе нашага смалярнага катла **губляе значную частку каштоўных матэрый** і дае толькі поўфабрыкаты шпігінару і смалы. З гэтых поўфабрыкатаў, пасьля даволі складанае перапрацоўкі, мы атрымліваем прадукты таксама ня вельмі высокае якасьці (лёгкія маслы, нік, ачышчаны шпігінар), пазбавіўшы сябе магчымасьці атрымаць самы дарагі прадукт—каніфоль і белы шпігінар.

Экстракцыйная каніфольна-шпігінарная вытворчасьць, як вытворчасьць рэнтабельная (у гэтай вытворчасьці скарыстоўваюць і сьвежыя карчы), ужо даўно вядомы ў паўночнай Амэрыцы, Нямеччыне, Чэха-Славакіі і ў некаторых іншых краінах. Рэагэнтамі для экстрагаваньня зьяўляюцца бэнзін, газа і інш. Аб'ём гадавой патрэбы сыравіны ў гэтых фабрыках—ад 5000 да 50000 куб. мэтраў.

У РСФСР гэткая вытворчасьць таксама даўно вядома, але яна мела невялікі маштаб. У больш шырокім маштабе разгарнулася экстракцыйная каніфольна-шпігінарная вытворчасьць з пабудовай у 1922-23 годзе Вахтанскае фаб

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР

аб вызваленьні тав. Прафэрансава Л. Л. ад абавязкаў кіраўніка Цэнтральнай Статыстычнай Управы БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР, на падставе арт. 47 Канстытуцыі БССР, пастанаўляе: па невыкананьне пастаноў ураду аб беларусізацыі апарату ЦСУ зьняць тав. Прафэрансава, Леаніда Лаўравіча, з пасады Кіраўніка Цэнтральнай Статыстычнай Управы Беларускай ССР.

СТАРШЫНЯ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР **А. Чарвякоў.**

САКРАТАР ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР **А. Хацкевіч.**

18-га лістапада 1929 г. Менск.

ПАСТАНОВА

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

ПА ДАКЛАДУ АСОБАЙ КАЛЕГІІ ВЫШЭЙШАГА КАНТРОЛЮ.

Заслухаўшы даклад Старшыні Асобай Калегіі Вышэйшага Кантролю па зямельных справах пры Наркамземе БССР аб працы Асобай Калегіі Вышэйшага Кантролю, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР адзначае:

1. Што ў правядзеньні і ажыцьцяўленьні клясавай лініі ў зямельнай палітыцы Асобая Калегія Вышэйшага Кантролю, у сучасным яе складзе, прыняла захады да спраўленьня памылак і выпадкаў скрыўленьня клясавай лініі, якія былі дапушчаны раней пры вырашэньні зямельных спраў і пытаньняў зямельнай палітыкі.

2. Разам з гэтым у рабоце зямельнага суду і зараз заўважана шэраг недахопаў, якія былі адзначаны яшчэ 28-VII-1927 г. Прэзыдыумам ЦВК па дакладу Асобай Калегіі Вышэйшага Кантролю, а іменна:

а) адсутнасьць дастатковай сувязі з працоўнымі масамі і грамадзкага кантролю над працай зямельнага суду наогул і Асобай Калегіі Вышэйшага Кантролю, у прыватнасьці;

б) нездавальняючы падбор і слабая кваліфікація кіраўнічых работнікаў зямельных камісій; асабліва недастатковы лік рабочых і батракоў у складзе акруговых і раённых зямельных камісій, а таксама наяўнасьць паасобных працаўнікоў, у тым ліку і паасобных спэцыялістых з чужога элемэнту, якія часта сьвядома не праводзяць правільнай зямельнай палітыкі савецкай улады;

в) адсутнасьць правільнага інструктаваньня і рэвізіі зямельных камісій Асобай Калегіяй і слабае правядзеньне гэтай працы акруговымі зямельнымі камісіямі;

г) наяўнасьць выпадкаў цеганіны і бюракратызму пры разглядзе зямельных спраў.

Да зьнішчэньня гэтых недахопаў з боку Асобай Калегіі Вышэйшага Кантролю ня было прынята належных мер.

3. Недахопамі таксама зьяўляюцца:

а) нездавальняючая арганізацыйная пабудова зямельных судоў і неўрэгуляваньне працэсу праходжаньня судова-зямельных спраў у зямельных камісіях;

б) недастаткова рашучае спыненьне яўна суцяжных спраў, якія па некалькі разоў рашаліся і ўноў уздымаліся ў мэтах зрыву земляўпарадкаваньня.

Выходзячы з адзначанага, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Даручыць Асобай Калегіі Вышэйшага Кантролю пры разглядзе зямельных спраў весьці рашучую барацьбу з праявамі скажэньня і скрыўленьня клясавай лініі ў пытаньнях зямельнай палітыкі. Усю сваю працу праводзіць, выходзячы з неабходнасьці калектывізацыі і вытворчага ўзмацненьня сельскай гаспадаркі, не дапушчаючы ўтварэньня хутароў, атрубаў і дробных пасёлкаў, а таксама і дробленьня сельскай гаспадаркі, якое цягне за сабою паніжэньне вытворчасьці сельскай гаспадаркі.

2. Маючы на ўвазе неабходнасьць разгрузкі нізавых зямельных органаў ад судовых спраў і дачы ім гэтым самым магчымасьці сканцэнтраваць усю сваю дзейнасьць навакол пытаньняў рэконструкцыі сельскай гаспадаркі, даручыць НК РСІ, НКЮ і НКЗему ў двухмесячны тэрмін распрацаваць праэкт закону аб рэарганізацыі зямельнага суда ў напрамку перадачы спрэчна-зямельных спраў у веданьне органаў НКЮ з тым, каб за зямельнымі органамі заставіць толькі вырашэньне і зацьверджаньне земляўпарадчых праэктаў і зьвязаных з імі пытаньняў. Пры распрацоўцы праэкту закону прадугледзіць найбольш шырокае ўцягненьне рабочых і сялян да ўдзелу ў разглядзе зямельных спраў.

3. У мэтах аздараўленьня асабовага складу зямельных органаў, даручыць Наркам РСІ і АВК пры правядзеньні чысткі зямельных органаў зьвярнуць асаблівую ўвагу на выняцьце з апаратаў клясава-варожых элемэнтаў і папаўненьне іх складу за лік рабочых, батракоў і бядняцка-серадняцкага актыву вёскі.

4. У мэтах узмацненьня грамадзкага кантролю над работай зямельна-судовых органаў, лічыць неабходным у бліжэйшыя часы правесьці і надалей праводзць сыстэматычна справаздачы на шырокіх сходах рабочых, сялян і чырвонаармейцаў, а таксам праз друк аб працы зямельнага суду і зямельнай палітыцы, якая праводзіцца савецкай уладай.

5. Даручыць акрвыканкомам забясьпечыць судова-зямельныя камісіі памяшканьнямі, неабходнымі сродкамі для працы, выездаў і г. д.

6. Даручыць Асобай Калегіі Вышэйшага кантролю і Народнаму Камісарыяту Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі распрацаваць час свае прапановы па пытаньні аб рэгуляваньні і вырашэньні зямельных спраў у Віцебскай акрузе, як рэарганізаванай у вопытна-паказальную.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

27-га кастрычніка 1929 г. гор. Менск.

Падрыхтоўка да перавыбараў саветаў.

(НА ПАСЯДЖЭНЬНІ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ).

17-га лістапада пад старшынствам т. Хацкевіча адбылося пасяджэньне Цэнтральнай Выбарчай Камісіі. Быў абраны прэзыдыум у складзе наступных асоб: т. т. Хацкевіч, Гантман з заменаю Міцьковым, Лукашэвіч, Аксючыц, Калодка, Галавач, Ашарэвіч, Рагачэўскі, Анішчэнка. Гэта пастанова камісіі ўносіцца на зацьверджаньне прэзыдыуму ЦВК БССР.

Адказным сэкратаром Цэнтральнай Выбарчай Камісіі зацьверджаны т.в. Баркан.

Плянам прадугледжваецца абсьледваньне працы па падрыхтоўцы перавыбараў па ўсіх акругах, праверыць удзел у перавыбарах па лініі ведамсьцьвеных устаноў, прафсаюзаў, каапэрацыйных, грамадзкіх і чырвонаармейскіх арганізацый. У сьнежні намечана правесьці шырокую нараду па пытаньню палітычных і арганізацыйных задач перавыбарчай кампаніі з удзелам прадстаўнікоў усіх акруговых, некаторых раённых, гарадзкіх і сельскіх выбарчых камісій, кіраўнікоў цэнтральных ведамсьцьвеных устаноў і грамадзкіх арганізацый.

З прычы таго, што з месц паступае шэраг запатрабаваньняў аб прысылцы інструкцыі пра перавыбары ў саветы, якая была выдадзена ў 1927 г. і на мясцох шмат дзе зараз ня маецца — камісія пастанавіла, захаваўшы існуючую інструкцыю пра перавыбары ў саветы, перавыдаць яе з уключэньнем усіх зьмен, дадаткаў і тлумачэньняў, якія былі зроблены прэзыдыумамі ЦВК СССР і БССР па працягу часу пасьля яе выданьня.

Да перавыбараў пастаноўлена выдаць папулярную літаратуру і некаторыя плякаты, спэцыяльнай камісіі даручана скласьці лёзунгі.

Выканаць поўнасьцю і ў тэрмін.

Паводле вестак Народнага Камісарыяту Гандлю па ўсёй БССР да 16 лістапада павялічаны плян хлебазагатовак выканан у сярэднім на 87,6 проц. Калі разглядаць выкананьне пляну па асобных акругах, дык прыдзецца сказаць, што назірасецца вялікая стракатасьць, якая сьведчыць аб тым, што ня ўсюды справа з загатоўкамі стаіць здавальняюча.

Прыклад добра праведзенай загатоўчай працы дае Віцебская акруга, якая свой павялічаны плян выканала на 129,8 проц. Блізка да выкананьня загатоўчых плянаў хістаецца ад 65 да 90 проц. Асабліва кепска стаіць справа з загатоўкамі хлеба ў Бабруйшчыне і Мазыршчыне, якія ня выканалі яшчэ нават першапачатковых плянаў. Бязумоўна, такое слабае выкананьне пляну ў гэтых акругах можна тлумачыць толькі тым, што ў іх яшчэ далёка недастаткова робіцца нажым на кулацкія гаспадаркі ў сэнсе выкананьня апошнімі тых цьвёрдых заданьняў, якія вызначаны кулацкім гаспадаркам агульнымі сходамі беднякоў і сераднякоў. Відаць, таксама слаба пастаўлена ў Бабруйшчыне, Мазыршыне, а таксама і ў іншых адстаючых акругах праца па поўнаму выяўленьню лішкаў хлеба ў кулацкіх і заможных гаспадарках. Выкананьне сваіх хлебазагатоўчых плянаў у Бабруйшчыне, Мазыршчыне, Полаччыне, Меншчыне і Гомельшчыне сьведчыць аб тым, што на мясцох яшчэ недастаткова прыцягнуты да дапамогі ў выяўленьні хлебных лішкаў у кулацкіх гаспадарках бядняцка-серадняцкія масы вёскі, што далёка яшчэ ня поўнасьцю скарыстоўваецца сельсаветамі іх права ў галіне адміністрацыйнага нажыму на кулака.

Наш плян хлебазагатовак павінен быць поўнасьцю выканан да 1 сьнежня. Што папы загатоўчыя пляны рэальны і што пры належна пастаўленай працы іх лёгка выканаць нават з правышэньнем,—аб гэтым нам добра гаворыць прыклад Віцебшчыны. Калі плян хлебазагатовак павялічваўся на 30 пр., дык добра ўлічваўся той факт, што мы далёка яшчэ ня выявілі ўсе хлебныя лішкі кулацкіх і заможных гаспадарак, а што ў апошніх захаваныя лішкі ёсьць, гэта бясспрэчна. Бясспрэчна таксама і тое, што ў кожным сельсавеце мы маем яшчэ кулачкоў, якія захаваліся над відам серадняка, а часам і беднячка—бывалі і такія выпадкі. Вось чаму неабходна скарыстаць час, які застаўся да 1 сьнежня для таго, каб поўнасьцю выявіць гэтых захаваўшыхся кулакоў, выявіць пры дапамозе бядняцка-серадняцкіх мас іх хлебныя лішкі і снагнаць апошнія.

Трэба яшчэ раз праверыць як працуюць нашы с.-с. і сельскія камісіі садзейнічаньня ў справе хлебазагатовак. Трэба скарыстаць усе меры адміністрацыйнага ўплыву для таго, каб узяць у кулацтва яго хлебныя лішкі. Трэба прыняць усе меры да таго, каб своечасова і поўнасьцю выканаць плян хлебазагатовак.

У рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь"

На зьмешчаныя заметкі ў Вашай газэце „Савецкая Беларусь" ад 4 красавіка 1929 г. за № 75 (2554) „Аб'ездчык спэкулянт" і ў той-жа газэце ад 18 верасьня 1929 г. за № 213 (2702), „Пад маскай партызана і бедняка" паведамляю наступнае: Па першай заметцы—спэкуляцыяй лесам ніколі я не займаўся, выпадкаў грубасьці з сялянствам у мяне ня было; з папоўскім дурманам я нарваў усялякую сувязь яшчэ да рэвалюцыі, выступаў супроць папоўскага дурману ў в. Крываносах.

Яшчэ ў 1918 г. вывешаныя дочкай—8 гадовай вучаніцай лёзунгі „не плаваць і на курыцу" былі ўжыты ў выніку хворай жонкі і малога дзіцяці. Ніякіх іншых лёзунгаў у тым ліку і „мужыкам не захадзіць" ня было; ня было таксама і выпадкаў выкрыка: „ах, ты мужыцкая хара", „ты з лапцямі пойдзеш да мяне ў хату?!"

Лесам карыстаўся на агульных пастановах з сялянствам па даведкам і сьпісам належных установ і лясных камісій.

Пачаты зруб, які за адсутнасьці сродкаў немагчыма было перавезьці, накрыць, пачаў траціць сваю тэхнічную якасьць, што і вымусіла мяне паруштуць бедняку в. Прус—Розуму С., які ў той час скончыў яго і ўвайшоў жыць.

Пераступка зруба па вышэйзгаданым прычынам мною лічылася не як спэкуляцыя лесам, а як спасеньне драўніны зь гніілі і згубы яе тэхнічнасьці, аб чым у свой час знаў і старшыня сел. лес. камісіі, які выдаваў на заяве жонкі даведку на атрыманьне леса на поўную пабудову хаты ў прысутнасьці прадстаўніка міліцыі (кажысь т. Клімовіча) і сэкратара с-с т. Русіка. Іншых пабудоў, як паказана, у газэце ня было.

Паказаньне ў заметцы пібыта я плакаў за прысуд над папом і што я з імпіў гарэлку—злосная хлусьня, так як указака вышэй—я з папамі парваў усялякую сувязь яшчэ да рэвалюцыі. У свой час па гэтай заметцы адміністрацыйнай Стара-Дароскага Л-ва было зроблена расьследваньне і на падставе рэзалюцыі агульнага сходу сялян в. Крывае было паслана ў рэдакцыю „Савецкая Беларусь" абвяржэньне.

2) Па другой заметцы ў газэце „Савецкая Беларусь" ад 18 верасьня 1929 г. за № 213 (2702) „Пад маскай партызана і бедняка" паведамляю. Пяменчыкам я ніколі ня быў, а зьяўляюся сынам селяніна. Ад бацькоў я ўпоў дзеля здабыцьця сабе хлеба па выхадзе са школы яшчэ ў 1907 г. з якога часу працаваў на поніце ў розных мясцох.

З прыходам белапалякаў у м. Ст. Дарогі (6-VIII—1919 г.) апошнімі быў арыштаваны і пасаджаны ў Слуцкую турму. Па выхадзе з турмы ні якім польскім шпіёнам я і бацька мой ня былі; а наадварот я працаваў у шэрагах партызанскага руху сумесна з т. т. Самахвалавым А Г., знаходзячымся ў сучасны момант у № дыв. у Магілеве і т. ный К. з в. Макарычы загінуў Чырв. арміі, вядомым жыхарам Дарогі свазім налётам на мястэчк польскай акупацыі. Ніякіх вы палякам красных партызан і ка я не рабіў, а наадварот с удзельнікам партызанскага руху чы ўзьярашаным ненавісьцю к б кам, зрабіўшым мне ня мала разбурэньня. Не адзін дзесят было на меня пушчана белапал не адзін дзесятак кілёмэтраў с жандармэрыя ў пагоне за мной. на прымусу удзел у барацьбе з лякамі сумесна з таварышамі Крыванос і Аточкі ў выгане бел з в. Урэчча і ў барацьбе су чырвонымі часьцямі пад м. Пагон (разрыў сувязі даух польскіх гр У свой час на хлусні гр. Пархім без усялякай невядомай мне пр быў арыштаваны агентам Чэка, ный С. Па расьследваньні выясн месца следаваньня Чэка мін банілі, пасьля чаго я і пачаў п на поніце ў м. Ст. Дарогі ў бы старшым Рэўкому т. Самахвалав некаторы час я быў мабілізаван працы на тэлеграфе.

У 1921 г. на хлусьні таксам кі Пархімовіча Д. я быў ар ны Нач. асоб. аддзелу т. Корбу па высьвятленьні справы ме баніў. Ніякай сувязі з бандытам кевічам я ня меў і не прычыня бойству т. Пархімовіча і Розума.

Выпадкі супроць мяне тлум імпічэньнем групы асоб, якія і мне як аб'ездчыку л-ва за ск пратаколаў. У ляськіцтве я служы чыкам з 1923 г. на пасаду якога маў дакументы ад Асавецкага с ВІК Русакова.

Першая заметка прапушчаная веркі фактаў, на страніцах газэты кая Беларусь" падказала безадк аўтараў, далейшай траўлі і апаро бяз усякіх падстаў. Другая замет равана з тэй мэтай, каб зьняць працы і лішыць куска хлеба, шт адбылося.

А па гэтаму працу рэдакцыю кая Беларусь" зьмясьціць на ст Вашай газэты вышэйскладзенае а жэньне і выдаць суду аўтараў скарыстаўшых газэту для ўласны

Ранавец, Емельян Про

АД РЭДАКЦЫІ: Зьмешчаючы абв не т. Ракаўца, рэдакцыя з свайг дадае, што факты выкладзеныя н каўца у зазначаемых заметках ра ваньнем не пацьвердзілісь. Аўтар так Абрамовіч А. і Камсамолец-б былі скарыстаны асобамі маючымі на т. Ракаўца і такім чынам у пакляп на апошняга. Матар'ял гэта вы рэдакцыяй накіраваны ба Аднракуратуры для расьсьледа прыцягненьня візоўных да адказн

ХРОНІКА

Перавыбары дэканатаў у С-Г. Акадэміі.

У Сельска-Гаспадарчай Акадэміі адбыліся перавыбары дэканатаў. Па аграфакультэту дэканам абран праф. Аляксееў і нам. асыстэнт Мецельскі, па факультэту калектыўнай гаспадаркі—дэканам дацэнт Айзенбэрг і намесьнікам—асыстэнт Ільлюшчанка, па лесфаку—дэканам дацэнт Коратняў і намесьнікам-асыстэнт Сергейчык. На факультэтах мэліарацыйным і земляўпарадкаўчым перавыбары адбудуцца гэтымі днямі.

Да рэарганізацыі прамысловага цыклю правгасу БДУ.

Пры Наркамасьвеце адбылася нарада па рэарганізацыі прамысловага цыклю правгасу БДУ. Праэкт рэарганізацыі быў прадстаўлен прафэсарам Серада.

Нарада ў прыцьцяе прызнала неабходным рэарганізацыю прамысловага цыклю ў бок большай спэцыялізацыі і абслугоўваньня адпаведных галін вытворчасьці. Для канчатковага вырашэньня гэтага пытаньня і перагляду навучальных плянаў складзена камісія, якой даручана скончыць працу да 25 лістапада.

На прамысловым цыклю меркуецца ўвесьці шэраг ухілаў для падрыхтоўкі спэцыялістаў у адпаведных галінах прамысловасьці: калькулятараў, рацыяналізатараў, тавараведаў і інш.

Перагляд навучальных плянаў.

Наркамасьветы канчаткова зацьвердзіў навучальны плян Сельска-Гаспадарчай Акадэміі па факультэтах буйнага земляробства і пераглядзецца навучальны плян аграфаку і земляўпарадкаўчага факультэту.

У новых навучальных плянах прыдан значна больш ўхіл у бок грамадзка-эканамічных ведаў.

Бел. Дзяржаўны Вандроўны тэатр выяжджае ў Лошніцу.

21 лістапада Беларускі Дзяржаўны Вандроўны тэатр пад кіраўніцтвам Галубка выяжджае ў в. Лошніцу Барысаўскага раёну для ўдзелу ў антырэлігійнай кампаніі ў так званае сьвята „Міхайлы". Тэатр у Лошніцы дасьць дзьве пастаноўкі і прыме ўдзел у дэманстрацыі якую арганізоўваюць мясцовыя арганізацыі. Трупа выяжджае ў поўным складзе, каб побач з спэктаклем даць вялікае канцэртнае адзяленьне.

БД Вандроўны тэатр рыхтуецца для абслугоўваньня калгасаў.

У сучасны момант Беларускі Дзяржаўны Вандроўны тэатр падбірае рэпэртуар, які папулярызуе калектывізацыю сельскай гаспадаркі.

У вясну Вандроўны тэатр з гэтым рэпэртуарам мае па ўвазе выехаць у раёны спаянной калектывізацыі.

Фізкультура.

Дзень фізкультуры ў Магілеве

Згодна вестак ВСФКБ у Магілеве заканчваецца пабудова дому фізкультуры. Акруговы савет фізкультуры падрыхтоўвае ўрачыстае адчыненьне дому.

Фізкультура — на беспераперыўны тыдзень.

ВСФКБ перавёў сваю працу на беспераперыўны рабочы тыдзень. Зараз распрацоўваецца пытаньне аб пераводзе заняткаў па фізкультуры на беспераперыўны рабочы тыдзень.

Суд.

Помста клясавых ворагаў

2-гі дзень працэсу.

На месцы падсудных кулакі-забойцы грамадзкага працаўніка камсамольца Комара.

Забіты лясьнік камсамолец Давід Комар у вёсках Хацежына і Галоўках Старасельскага с-с. зьяўляўся актыўным працаўніком. Акрамя непасрэдных абавязкаў лясьніка ён як сябра сельсавету выкрываў скрытыя аб'екты абкладаньня ў кулацкіх гаспадарак, праводзіў працу сярод беднаты і батрацтва як на галіне калгаснага будаўніцтва, так і наогул.

Галоўны абвінавачаны Сідар Комар на судзе імкнецца выгараздзіць астатніх падсудных. Ён заяўляе суду:

— Я ездзішу лясьніка Комара, але гэтага рабіць я не хацеў—проста здарыўся нясчасны выпадак.

17 кастрычніка, кажа Сідар Комар, увечары я запрог каня і разам з братам Язэпам паехаў у лес зьбіраць сучча. Не пасьпелі мы заняпрыць каня, накласьці воз як адкуль не вазьміся, лясьнік Комар, які закрычаў на нас:

— Што вы робіце?

— Як што? дровы зьбіраем.

— Вон з лесу! ты кулак, дроў можаш купіць!

Я, бязумоўна, рэхвалявацца і мы з Давідам Комарам схапіліся біцца. Доўга біліся—я клікаў на дапамогу брата Язэпа, але ён спалохаўся і ўцёк.

У часе тузаньня я схапіў лясьніка за глотку, пашчынуў і задушыў на сьмерць.

— А навошта вы бралі сякеру?

— Таксабе... Вядома, едучы ў лес, думаў што-небудзь адсячы.

— А гаспадарка ваша моцная?

— А хто яе ведае. Можа і моцная, усё можна казаць, хіба-ж язык людзям завяжаш.

Д. Кастроў.

Новыя кнігі.

Паступілі ў рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя кніжкі выданьня Беларскага Дзяржаўнага Выдавецтва.

1. „Мае знаёмыя" М. Пацёмкіна. Пераклад з расейскай мовы. Малюнкі запазычаны з расейскага выданьня. Стар. 80, цана 27 кап.

2. „Чырвоны дэсант" Д. Фурманаў. Пераклад Ю. Л. Стар. на 20 кап.

3. „Шводкі нашага эдараўя" Я. ноўскі. Стар. 48, цана 15 кап.

4. „Як гаспадарыць у калгасе на значэньня" А. Сапорым. Стар. 56 25 кап.

Апавяшчэньні.

27-XI—29 г. роўна а 6 гадзіне ўвечары ў залі Акруговкому КП(б)Б (3-ці паверх) адбудзецца нарада Фрунзаўскага р. па пытаньням:

Аб ходзе перавыбараў рэдкалегій насьценгазэт.

Аб ходзе партасьветы.

А рабоце вайсковых гурткоў і ячэек Асоавіахіму.

На паказаную нараду ў абавязковым парадку павінны зьявіцца: апоргі ўсіх ячэек КП(б)Б, старшыні завфабместкомаў (партыйцы), прымацаваныя таварышы ад РК да рэдкалегіяў для перавыбараў (гл. „Зьвязду" за 5-XI—29 г.), старшыні рэдкалегій насьценгазэт і рабкоры (партыйцы камсамольцы).

Увага. Прымацаваныя т.т. ад РК да рэдкалегіяў павінны тэрмінова прыступіць да работы згодна разасланых матар'ялаў РК.

На ўказаную нараду падрыхтаваць інфармацыйныя даклады аб ходзе перавыбараў насьценгазэт наступным рэдкалегіям: зав. Камунар, Меншвэй, 1-я друкарня, ЦСУ, Дрэваапрацоўшчыкі, ЦВК, Наркамзем, Эльвод.

Апоргам ячэек, якія згодна а. РК да гэтага часу не прадставі аб партасьвеце ў РК абавязкова ставіць гэткія на наказаную нараду

ДОМ АСЬВЕТЫ.

19-XI вечар юнсэкцыі прысв Х-годзьдзю КІМ. Пачатак роўна а Білеты ў доме асьветы.

23-XI концэрт заслужанага Рэспублікі прафэсара М. Эрдэнка, піяністкі Д. Гольдэр. Пачатак а 9 Білеты ў доме Асьветы з 12 гад і з 6 гадз. да 10 гадзін.

ПЭДГАБІНЭТ.

Сёньня роўна ў 7 гадзін увечар сэкцыі інтэрнацыянальна-клясавага ваньня; заняткі гуртка па жывому для дашкольніц сёньня ў 8 гадзін; кі гуртка па працоўных працэсах стаўнікаў і канцэнтру сёньня ў 8 увечары.

Канфэрэнцыя выкладчыкаў грамад ства сёньня ў 6 гадз. увеч.

Адказны рэдактар П. ШАСТ

РАБСЕЛЬКОРЫ НАМ ПІШУЦЬ.

Новая пасада ў райвыканкомах.

Віцебск, 17-XI. У сувязі з рэарганізацыяй акругі, пры РВК уводзіцца штатная адзінка старшыні раённай рэвізійнай камісіі—ён-жа ўпаўнаважаны РСІ.

Адчынілася сто новых школ.

Віцебск, 14-XI. Віцебская акруга ў гэтым годзе перайшла на ўсеагульнае навучаньне дзяцей школьнага ўзросту. Каб поўнасьцю забясьпечыць выкананьне пастановы аб усеагульным навучаньні, адчыніліся па акрузе звыш плянавых мяркаваньняў яшчэ сто новых камплектаў пачатковых школ.

Да адказнасьці за нядбайства ў загатоўках.

Гомель, 17-11. Ня гледзячы на своечасовае паведамленьне аб адпраўцы баржы з аўсом, апарат Лесбелу на сваёй нядбайнасьці дапусьціў прастой баржы з аўсом у працягу 3-х дзён. Гэтым самым нанесена страта дзяржпараходству і павышан кошт аўсу. Пракуратура прыцягнула адміністрацыю Лесбела да судовай адказнасьці.

ТЭАТР-КІНО

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА".	З панядзелка 18 лістапада „Праэкт інжынэра Стронга" Пачатак а 7 гадзіне.
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	З панядзелка 18 лістапада Амэрыканскі фільм „НЕБАСКРОБ" у 6 частках. Звыш праграмы: ХРОНІКА САВКІНО № 60. Пачатак а 7 гадзіне.
КІНО „ПРАЛЕТАРЫ"	З панядзелка 18 лістапада Бэстэр Кітон у амэрыканскай камэдыі „ГЕНЭРАЛ" у 7 част. Звыш праграмы: кіно-хроніка „Савкіно" № 61.
1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР"	З панядзелка 18 лістапада 1) „4 живые дома" у 5 частках 2) „Адна з тых, якіх шмат" Камэдыя ў 2 частках

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА ГАЗЭТЫ „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ" АПАВЯШЧАЮЦЬ, ШТО ЯНЫ, ПАЧЫНАЮЧЫ З 17 ЛІСТАПАДА, ВЫХОДЗІЦЬ СВОЙ ВЫХАДНЫ ДЗЕНЬ З НЯДЗЕЛІ НА АЎТОРАК.

Газэта будзе выходзіць па панядзелках і не будзе па серадах.

Праца ў рэдакцыі і канторы праводзіцца ад 9 гадзін да 15 з паловай.

Рэчыцкі ЗАГС выклікае гр-на Анапіева Карла і гр-ну Анапіеву Зосю па справе скасаваньня шлюбу.

Барысаўскі райгорзагс выклікае гр-ку Капусьціну Анастасію Міхайлаву на 3-е сьнежня с-г. па справе аб скасаваньні шлюбу згодна заявы гр. Капусьціна Сяргея.

ПАТРАБУЕЦЦА на сталую працу машыністка-перакладчыца, добра ведаючая беларускую мову. Зьвяртацца ў рэдакцыю газэты „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ".

Навукова-Мэтод. Камітэт і Белдзяржвыдавецтва просіць усіх выкладчыкаў рабфакаў, вячэрняга рабочага ўнівэрсытэту, пэдтэхнікумаў і пэдкурсаў зьвяртацца на паседжаньне па пытаньню рэкамэндацыйных сьпісаў падручнікаў для адзначаных устаноў.

Паседжаньне адбудзецца 19 лістапада а 7 гадз. увечары ў памяшканьні НКА, пакой 9—10.

ГОСИЗДАТ РСФСР КНИГА-ПОЧТОЙ, МИНСК

КНИГА-ПОЧТОЙ высылает все книги на русском языке, имеющиеся на книжном рынке, немедленно по получении заказа;

КНИГА-ПОЧТОЙ извещает свою постоянную клиентуру о выходящих новинках по интересующим со вопросам;

КНИГА-ПОЧТОЙ высылает книги почтовыми посылками или бандеролью наложенным платежом; При высылке всей стоимости вперед—Пересылка бесплатно.

заказы посылайте по адресу:

ГОСИЗДАТ РСФСР КНИГА-ПОЧТОЙ, МИНСК

ВСЕСОЮЗНЫЙ КОЖЕВЕННЫЙ СИНДИКАТ (ВКС)

ЗАГОТОВЛЯЕТ ЧЕРЕЗ СВОИ ЗАГОТПУНКТЫ В НЕОГРАНИЧЕННОМ РАЗМЕРЕ ВСЕ ВИДЫ КОЖЕВЕННОГО СЫРЬЯ:

БЫЧИНУ * ЯЛОВКУ * КОНИНУ * КОЗЛИНУ * ОВЧИНУ ОПОЕК * ВЫРОСТОК * ШКУРЫ СВИНЕЙ * ОЛЕНЕЙ СОБАК * МОРСКОГО ЗВЕРЯ * ОСЛОВ * ЗМЕЙ * ЯЩЕРИЦ и всяких других животных и зверей, шкуры которых могут быть использованы в кожевенном производстве.

Из всех указанных шкур наши кожевенные заводы и фабрики вырабатывают все виды кожтоваров: обувь, шорные изделия, галантерею и пр.

Сдавайте шкуры на заготовительные пункты Кожсиндиката, где Вам заплатят установленную Наркомторгом полную цену. На заготпунктах Кожсиндиката Вам дадут нужные указания, как снимаются шкуры со всяких животных и зверей.

Не закапывайте в землю палых свиней, собак и др. животных вместе со шкурой. Снимайте шкуры с резных и палых свиней и др. животных. Колхозы! организуйте ловлю и забой бродячих собак.

СДАВАЙТЕ ВСЕ ШКУРЫ КОЖСИНДИКАТУ!

МОМЕНТАЛЬНЫЙ АВТОМАТИЧЕСКИЙ СЧЕТЧИК (усовершенствованный). Цена 50 к. Дает немедленно, без всяких знаний и наставлений, готовые результаты умножения, деления и вычисления процентов с быстротой чтения глаза. Высылается немедленно по получении заказа и 50 к. За пересылку и упаковку 20 к., всего 70 к. (можно марками). Наложенн. платеж от 4 р. Заказы и деньги направляйте по адресу: Москва 14, Главный почтамт, почтовый ящик № 1084-118 А. И. ЦУКЕРШТЭЙНУ.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Перарэгістрац. карт. Малахавай М., выд. Барысаўск. пасрэдбюро, кв. 74 п.

— Сяброўскі білет № 6-4795, выд. саюзам будаўнікоў, плян дома і пасьведчаньне дома на імя Бельскага А. Д., кв. 75 п.

— Кніжка на права атрыманьня пэнсіі для дзіцяці Целяпуна А., выд. Мазырскай страхкасай, кв. 76 п.

— Заборная кніжка № 767 Калоднага Н., выд. праўл. Мазырск. ЦРК, кв. 77 п.

— Конская карт. № 3771 Харытонавіча В. П., выд. Жыткаўскім РВК, кв. 85 п.

— Пасьведчаньне за № 22-341 аб нягоднасьці да вайсковай службы Казлова С., выд. Мазырск. ваенкаматам, кв. 86 п.

— Прызыўная кніжка Камара Д. Г., выд. Барысаўск. РВК, кв. 87 п.

— Перарэгістрац. карт. Хрыніна К. З., выд. Барысаўск. пасрэдбюро, кв. 88 п.

— Сяброўскі білет за № 3036 Галаўлёва С. А., выд. Аршанск. саюзам працасьветы, кв. 89 п.

— Вучотна-конская карт Рурэйчанка выд. Д., Зембінскім РВК, кв. 90 п.

— Асабовая кніжка Рэвута І. П., выд. Чэрвенскім вайсковым сталом, кв. 92 п.

— Партбілет № 1103266, выд. яч. пры зав. „Труд" Мазырск. акр, 2) Сяброўскі білет № 215-466, выд. саюзам дрэваапрацоўн. 3) Асабовая карт. на імя Юнашы М. К., кв. 91 п.

— Прыпісная дапрызыўная кніжка Старавойтава І., выд. Азарыцкім РВК, кв. 93 п.

— Вайсковы білет Цямока Р. І., выд. 2-й прызыўн. вайсков. каміс. Барысаўск р-пу, кв. 94 п.

— Пашпарт № 1287 Арлоўскага В. О., выд. Круглянскім РВК., кв. 72п.

— Паявая кніжка Мядзьвецкага В., выд. Круглянскім спаж. т-вам, кв. 72п.

— Асабовая кніжка Недабоя Н., выд. Круглянскім РВК, кв. 72п.

— Асабовая кніжка Данілава М., выд. Круглянскім РВК, кв. 72п.

— Паявая кніжка Астапава Е., выд. Круглянскім спаж. т вам, кв. 72п.

— Пашпарт № 455 Крачкоўскага І., выд. Круглянскім РВК, кв. 72п.

— Сяброўскі білет № 32052 Крачкоўскага І., выд. саюзам горнарабочых, кв. 72п.

— Камсамольскі білет Крачкоўскага І., выд. на Туманным рудніку, кв. 72п.

— Паявая кніжка Тамбова Ф., выд. Круглянскім спаж. т-вам, кв. 72п.

— Паявая кніжка Драздова Н. К., выд. Круглянск. спаж. т-вам, кв. 72п.

— Паявая кніжка Варапаева Н., выд. Круглянскім спаж. т-вам, кв. 72.

— Паявая кніжка Бабкова П., выд. Круглянскім спаж. т-вам, кв, 72п.

— Паявая кніжка Гарбановіча, выд. Круглянскім спаж. т-вам, кв. 72п.

— Камсамольскі білет № 60335 Блізнякова Д., выд. Аршанск, акр. КСМ, кв. 72п.

— Сяброўская кніжка Вайсмана А. М., выд. Пасталеўскім завкомам, Мазырск. акр., кв. 72п.

— Паявая кніжка Каповелава Н., Круглянскім спаж. т-вам, кв. 72п.

— Конская карт. Кнота С., выд. халіцкім с.-сав., Барысаўск. р-пу, кв.

— Сяброўскі білет № 135 Прас ва Р. М., выд. саюзам мэдсанп кв. 681 п.

— Этрычн. выпіс № 225 Курга Л. П.—выд.—Рэчыцкім загсам, кв. 6

— Бюлетэнь Пінчук Р. В.—выд. чыцк. гар. амбулятор, кв. 631.

— Паявая кніжка № 5188 Н. С., выд. Рэчыцк. ЦРК, кв. 631

— Партбіл. № 319989, выд. Слуц. КПБ і камсамольскі білет № 4337,— бабруйскім АКК па імя Матрух П. Р. кв. 631.

— Пасьведчаньне аб сканчэньні 4-г Стома Ф. Ф.,—выд. 6-й польскай шк кв. 897.

— Прыпісная кніжка дапрызыў Рынга С. І.,—выд. Менакрвасенкам кв. 898.

— Біржавы нумар Любчанскай Ф. выд. Менбіржай працы, кв. 899.

— Пашпарт Беляўскай Н. Г.,— Менакрміліц., кв. 900.

— Пасьведчаньне аб сканчэньні ін будаўнікоў і характарыстыка Галент Я. Ц., кв.